Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Традыцыя і сучаснасць ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Васіль Петручук ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 02 (2800) Год LV | Беласток, 10 студзеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Добры вечар усім вам...

Добры вечар усім вам, шчасліва радзіна —
нарадзіла Дзева Прадвечнага Сына.
Хвалу Богу дайма, вясёла спявайма —
Святы Вечар на зямлі!

Не ў пышных палацах Хрыстос нарадзіўся,
але ў белых яслях Хрыстос упавіўся.
Хвалу Богу дайма, вясёла спяваймя —
Святы Вечар на зямлі!

З Ражджаством Хрыстовым мы вас вітаем
і разам з вамі Хрыста праслаўяем.
Хвалу Богу дайма, вясёла спявайма —
Святы Вечар на зямлі!

Добры вечар, людзі, хай вам радасць будзе,
усе мы вас вітаем і шчасця жадаем.
Хвалу Богу дайма, вясёла спявайма —
Святы Вечра на зямлі.

Усіх нашых Чытачоў віншуем
з Ражджаством Хрыстовым

Ніва

Зірнуўшы наўкола ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вось і пакаціўся 2010 год сваім парадкам, незваротнай хадой і сваімі штодзённымі адзнакамі. Ад новага года заўсёды чакаецца нечага незвычайнага і дзівоснага, але чым больш жывеш, тым больш разумееш, што нічога не мяняецца пад месяцам і свет іншым і дабрэйшым зусім не становіцца. І цудаў не здараецца і людзей менш не гіне. Ужо першыя дні 2010 года застракацелі інфармацыйнымі паведамленнямі пра тэракты, бамбёжкі, замахі, аварыі і іншыя змрочныя праявы людскога быцця на гэтай планеце. Агрэсіўныя дзяржавы зазвычай ваююць з суседзямі, багата на зямлі грамадзянскіх канфліктаў, а дыктатарскія рэжымы даводзяць свой народ да адчаю...

Албанія — забытае месца Еўропы ☞ 5

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

Дзядоўскае турнэ...(7) ☞ 12

Ганна КАНДРАЦЮК

Едуць гарадскія

Ілона КАРПЮК

У нас у пушчу заўсёды было блізка, таму мы бегалі туды па елкі, каб у хаце пахла хаця паўжывым, аднак, дрэвам. Некаторыя ў той час хавалі ўжо за шафамі пластмасавыя ёлкі. Выцягваеш, праціраеш ад пылу і гатова. Мне аднойчы дзіцём здарылася нават выцягнуць дрэўца ў чэрвені, зразумела, неверагодна я тужыла па Калядах. У гарадской кватэры з версалькай і сценкай шмат месца для ёлкі не заставалася, таму кожныя святы ўсе як адзін перастаўлялі мэблю. Пад нашай „зялёнай паннай" падарункі ад Дзеда Мароза знаходзілі наогул перад Куццёй, бо на найважнейшую ў годзе вячэру хуценька пераязджалі мы на вёску. Толькі раз не было звычайнай куцці. Я ўжо гэтага не помню, але было так: дзед пайшоў у клуню па сена. Прынёс, але, паводле сведкаў, перабольшыў колькасць. Бабуля раскрычалася, абыдвое абразіліся і куцці не елі. Нават я не ведала, што мае дзяды былі такія ганарлівыя. Я ўжо помню толькі тыя спакайнейшыя святы. А сёння сена можна нават купіць з газетай, непатрэбны ўжо сенакосы і клуня.

У дзіцячы час вочы манілі каляровыя лямпачкі і бліскучыя шарыкі. Крыху шкадавалі, што не маем „аплаткі", якой дзяліліся па тэлевізары. Смак куцці быў аднак лепшы за ўсё іншае. Гэта адзіны такі смак, можа толькі аўсяны кісель можа перабіць характэрнасць смаку каралевы Каляд. Па гэтыя смакі ехалі мы да бабулі на вёску. Па дарозе кожны год мы з сястрой ладзілі конкурс, у якім, дарэчы, вырашаў выпадак. Кожная злічвала праз сваё акно колькасць ёлак, якія бачылі ў прыдарожных дамах. Адна, дзве, трыццаць. Бывала нават больш. З гадамі задумваліся, ці апрача ёлак улічваць светлавыя дэкарацыі на балконах і ёлкі на панадворку. А пасля ўжо не стала ні дзеда, ні бабулі. Што рабіць? Сядаць толькі чатыром да куцці? Мама можа і хацела. Шмат яе знаёмых куццю арганізавалі па-гарадскому. Прывозілі бацькоў з вёсак, ёлкі прыбіралі то на чырвона, то на золата, то ў серабро. Боршч прыпраўлялі лепшымі купленымі дадаткамі. Можна было зварыць кісель з пакеціка, бо дзецям быў ён смачнейшы, а і пра збожжа не трэба было клапаціцца. У некаторых знайшліся б нават і шампіньёны. Дзевяностыя гады ў гарадах былі часам рэвалюцыі, асабліва ў такіх як Гайнаўка, у якую пераехала большасць вяскоўцаў. „Якая традыцыя? Гадоў шэсьдзесят-семдзесят таму на большасці нашых вясковых сталоў не было дванаццаці ці трынаццаці страў, а толькі куцця, боршч ці боб", — кінуў у дыскусіі мой знаёмы. На маю думку мусілі быць і сушаныя грыбы, а не шампіньёны, тым больш у пушчанскіх людзей. І абавязкова гэтая паўжывая ёлка, аздобленая цукеркамі, самастойна зробленымі ланцугамі. Помню, што ў маіх дзядоў, амаль рытуальна, да галінак прычаплялі драўляныя птушкі. Хаця ў бледных колерах, але былі яны святасцю.

Хаця адны і тыя ж Каляды, а біліся між сабой. Змагаліся за пахі, настроі і абрады. Цёпла-прасторныя на вёсцы і цесна-каляровыя ў горадзе. Але як калядаванне, дык толькі на вёсцы! Горад ніколі мне не асацыяваўся з гучнымі калядкамі. Каляднік у горадзе нібыта няпрошаны госць хацеў пераступаць парог 50-метровай кватэры, узятай у цяжкі для сплачвання крэдыт. Да гэтага з неахайнай батлейкай! Такі экуменізм. Але стараюся зразумець усіх. Тых, якія калядуюць не ў свае святы (мне таксама здаралася спяваць у каталіцкіх пляменнікаў). Стараюся разумець тых, якія вязуць дзядоў у горад, хаця ведаю, што тым другім найлепш у сваёй хаце. Прабую зразумець тых, якім святы ў горадзе — адзіная ў годзе магчымасць добра пагуляць, бо ў такія гарадкі як Гайнаўка, Бельск ці Сямятычы прыязджаюць калегі і сяброўкі са школьнага часу. Няма што лаяць і тых, якія з сям'ёй не сустракаюцца, бо адпачываюць на лыжах ці Карыбскіх астравах — там яны ў вузкім крузе самых блізкіх. Найлепш разумею аднак тых, якія на вёску ездзяць нягледзячы на моды, бо таго чакаюць дзяды або памяць аб іх. Адначасова цешыць мяне, што дзякуючы модам на гарадскіх сталах паяўляецца свойскі, хатні хлеб, спечаны ў духоўцы, што паяўляецца хрэн куплены „на рыначку" ад бабулькі, свойскі. Але калі паявіцца на калядным стале сушы — я і ад яго не адвярнуся.

9 770546 196000

Зірнуўшы наўкола

Вось і пакаціўся 2010 год сваім парадкам, незваротнай хадой і сваімі штодзённымі адзнакамі. Ад новага года заўсёды чакаецца нечага незвычайнага і дзівоснага, але чым больш жывеш, тым больш разумееш, што нічога не мяняецца пад месяцам і свет іншым і дабрэйшым зусім не становіцца. І цудаў не здараецца і людзей менш не гіне. Ужо першыя дні 2010 года застракацелі інфармацыйнымі паведамленнямі пра тэракты, бамбёжкі, замахі, аварыі і іншыя змрочныя праявы людскога быцця на гэтай планеце. Агрэсіўныя дзяржавы зазвычай ваююць з суседзямі, багата на зямлі грамадзянскіх канфліктаў, а дыктатарскія рэжымы даводзяць свой народ да адчаю. Прыкладам, як у Самалі. Хутка найменне „самалійцы" стане ўвогуле агульным. Гэтая афрыканская нацыя за апошняе дзесяцігоддзе пераўтварылася ў сапраўднае дзікае племя бандытаў і рабаўнікоў. Адны з іх гойсаюць па акваторыі і захопліваюць без разбору караблі, іншыя распаўсюдзіліся па еўрапейскай Скандынавіі і ўжо таксама хапаюцца за зброю, нібыта „ў імя Алаха". І ніхто не можа даць з імі рады. А вытокам такой агрэсіўнасці было тое, што ў іх дзяржаве, на іх роднай зямлі, для карэннага насельніцтва былі створаны невыносныя, нялюдскія ўмовы жыцця. У выніку бандыцтва стала ці не адзіным спосабам светапогляду і існавання цэлага народа.

Ды што там далёкія афрыканцы! Зірнуўшы наўкола на тое, што робіцца ў суседзяў, задумваешся пра шляхі развіцця і пра хаду гісторыі. Возьмем тую ж Расію, намінальна славянскую і хрысціянскую. Пры Гарбачове і Ельцыне, пры ўсіх хваробах і болях трансфармацыі, яна зазнала перыяд кароткага культурнага адраджэння, палітычнай адлігі і фармавання вольнага мыслення. Роўна дзесяць гадоў кагэбэшнага пуцінізму знішчылі ў гэтай велізарнай краіне пачаткі грамадзянскай супольнасці, эканамічнай свабоды, судовай справядлівасці і цывілізаваных стасункаў з суседзямі. Зноў чуем антызаходнюю прапаганду, зноў бачым дзяржаўны абсалютызм, зноў назіраем ксенафобію, зноў адчуваем шавіністычную нянавісць. Галоўная ж ахвяра — сам расійскі народ. Людзі гатовы падтрымаць дзяржаўную агрэсію супраць Грузіі ці Украіны, але не хочуць асэнсаваць хто і як кіруе ў іхняй краіне, што робіцца на іхняй тэрыторыі. Імперскае мысленне настолькі ўкаранілася ў свядомасць, што спадзявацца на нейкае дзівоснае прасвятленне мазгоў марна. Тым больш, што традыцыі такой ментальнасці сягаюць ажно ў старажытнасць, бяруць пачаткі ад дзікай мангольскай арды. Тут патрэбныя дзесяцігоддзі для змены ўсёй сутнасці Расіі.

Рэспубліку Беларусь Масква адназначна разглядае як свайго васала і ўсяляк імкнецца „паставіць на месца". Зараз зноў загаварылі пра пераход на поўны мытны разлік за пастаўкі нафты. Гэты мыльна-газавы серыял, якім пачынаецца новы год, ужо парадкам абрыд усім „гледачам". Ніхто ўжо не перажывае так востра тое, што дзеецца на „сцэне". Саюзны тэатр абсурду неўзабаве выпусціць на публіку яшчэ колькі актаў перамоўных жарсцяў і ўсё завершыцца традыцыйным хэпі-эндам. Ролі распісаны заранёў, пытанне толькі ў ганарарах. Старэйшыя людзі памятаюць, як СССР увальваў велізарныя сродкі ў розныя канібальскія рэжымы ў Афрыцы, да апошняга падтрымліваў кубінскіх і нікарагуанскіх рэвалюцыянераў. Усё гэта ішло як у бяздонную бочку. А тут цэлая Беларусь. Не можа нас кінуць братні народ, можна не перажываць. У прыродзе такога не бывае, каб драпежнік адкусіў уласную лапу.

Зноў загаварылі і пра пабудову на Астравеччыне атамнай электрастанцыі. Ці не будзе гэта платай Расіі за ільготныя цэны на сыравіну? А пакуль іншы сусед — Літва — спыніла працу Ігналінскай АЭС. Ці будзе Літва будаваць новую з дапамогай Еўрасаюза — пытанне. Але чамусьці можа існаваць пакуль і без атамнай станцыі. І з Расіяй можа дамовіцца пра кошты на газ, не саступаючы ў прынцыповых пазіцыях сваёй маёмасці і нацыянальных інтарэсаў. Вось і задумваешся чарговы раз пра шляхі развіцця...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Час збіраць камяні...

„Камень Міндоўга"... Якую трапную назву для свайго новага зборніка вершаў узяў Сяргей Чыгрын. Трапную, аб'ёмную і змястоўную. Гэтая назва сама па сабе ўжо вельмі шмат гаворыць як пра аўтара, так і пра змест.

Паеду ў Наваградак,
Каб спатыкнуцца
Аб камень Міндоўга,
Аб які спатыкнуўся
Адам Міцкевіч.

У гэтых радках усё... І мары паэта, і надзеі творцы, і яго збалелая душа, і патрыятычны дух лепшых прадстаўнікоў яго нацыі, які перадаўся яму ад продкаў, і разуменне таго, наколькі слаўная і неабходная, але ж і настолькі складаная ды балючая гэтая місія, місія сучаснага беларускага творцы. Праўда, на нашай зямлі гэтая місія і раней не была вельмі салодкай. Але ж нехта мусіць славіць свой край і свой народ, усхваляць у кожным радку веліч сваёй нацыі і свята верыць у яе. І разам з тым захапляцца прыродай, славутымі імёнамі роднага краю, хаткай на вёсцы, таямніцамі кахання, разважаць пра цяперашняе зямное жыццё, задумвацца пра вечнасць...

Гэта ўсё так па-беларуску, па-ліцвінску, па-крывіцку, па-слонімску, па-наваградску, па-тураўску... Гэта ўсё так панашаму! Цёпла, ласкава і асцярожна, як у археолага, які знайшоў каштоўнейшы старадаўні скарб і раскопвае яго маленькім пэндзлем з валаскоў вавёрчынага хваста, каб не дай Бог не пашкодзіць, не прысыпаць выпадкова, не зрушыць з месца ні аднаго фрагмента, ні адной дэталі гэтай велічнай знаходкі. І ўсё дзеля таго, каб паказаць іншым людзям гэты шчодры падарунак гістарычнай ці духоўнай спадчыны ў тым выглядзе, у якім ён адкрыўся яму.

Так пяшчотна і адказна да кожнага верша, да кожнага радка і да кожнага слова ставіцца Сяргей Чыгрын, вядомы беларускі творца са Слоніма. Яго творы — не рэдкасць. Гэта адзін з самых пладавітых дзеячаў на Гарадзеншчыне і Беларусі. Яму даволі часта ўдаецца пацешыць чытача напісаным і выдадзеным. Але ад гэтага яго друкаванае слова не становіцца якімсьці шэраговым або зацёртым. Усё якраз наадварот — у кожнай кнізе новыя здабыткі і цэлыя адкрыцці.

Вось і „Камень Міндоўга", які пабачыў свет у 2009 годзе. Гэты зборнік чытаецца адразу і да канца. А пасля яго хочацца зноў і зноў браць у рукі, адчыняць на выпадковай старонцы, і зноў атрымаць асалоду ад разваг аўтара пра нашу родную мову, узгадаць яго пытанне да Кузьмы Чорнага, з'ездзіць з ім і з забытай паненкай да фальварка, перажыць разам яшчэ раз 1794 год, прачытаць малітву, пазнаць у зашыфраваных радках „Калізіяў душы" твар яго і сваёй матуляў...

А пасля, як кніга яшчэ раз прачытаная, погляд спыняецца на старонцы з надпісам „Змест", каб зноў адчыніць вершы прысвечаныя Васілю Быкаву, Ларысе Геніюш, Якубу Коласу... Усім тым, хто некалі, у сваім жыцці, мелі неасцярогу і адначасна шчасце спатыкнуцца аб камень Міндоўга...

Сяргей Чыгрын у сваім зборніку нібыта заклікае ўсіх беларусаў наведаць свой уласны Наваградак і пашукаць там той камень. Бо ён, гэты камень Міндоўга, належыць усім, усёй нацыі, і толькі чакае, калі па яго прыйдуць. Чакае таго і той Наваградак, які будуецца ў душы кожнага чытача такімі архітэктарамі слова як Сяргей Чыгрын.

Камень Міндоўга, як і свой Наваградак, можна знайсці ў кожным вершы выдадзенага зборніка Сяргея Чыгрына. Дастаткова толькі яго адчыніць, ды пачаць чытаць. Далей усё пойдзе само па сабе. Тая энергетычная сіла, якую ў кожным радку пакінуў аўтар, пакажа туды, да свайго Наваградка і да свайго каменя Міндоўга, самую кароткую дарогу.

Бо час раскідваць каменне ўжо мінуў для беларусаў. Прыйшоў час збіраць камяні. І адзін з такіх камянёў — „Камень Міндоўга", аўтарства Сяргея Чыгрына, ужо пакладзены ў скарбонку беларускай нацыянальнай культуры.

Віктар САЗОНАЎ

Вачыма еўрапейца

Больш аптымістычна

Апошнія тыдні старога года прынеслі некалькі аптымістычных інфармацый, калі гаворка пра польска-беларускія стасункі, таксама і тыя лакальнага характару, кранаючыя і беларускую меншасць на Падляшшы. Па-першае, пасля трох гадоў фармальнага маўчання Беласток і Гродна нанова наладзілі афіцыйныя кантакты і граданачальнікі падпісалі дамову аб супрацоўніцтве. Амаль у адзін час у Беларусі прабываў польскі міністр культуры і нацыянальнай спадчыны Багдан Здраеўскі на запрашэнне (якое ў МКіНС урэшце дайшло) яго калегі Паўла Латушкі. У час гэтага візіту міністр Латушка аб'явіў 2010 год таксама ў Беларусі Годам Шапэна. Як вынікала з афіцыйнага камюніке, пасля спаткання кіраўнікоў абодвух ведамстваў культуры, вялася размова м.інш. аб пашырэнні супрацоўніцтва паміж школамі, музычнымі і фільмавымі вучэльнямі ды опернымі тэатрамі, а эксперты г.зв. гістарычных гарадоў маюць весці абмен вопытам. Было ўзгоднена таксама, што мае быць падтрыхтаванае паразуменне аб супрацоўніцтве польскага і беларускага міністэрстваў культуры.

Тры дні да канца года падляшскія радныя прынялі рашэнне „ў справе наладжання супрацоўніцтва датычнага супольнай падрыхтоўкі праекта звязанага з гаспадарчай прамоцыяй Падляшскага ваяводства і горада Гродна". Як напісана ў абгрунтаванні пастановы, гэты праект адносіцца да прыярытэту змешчанага ў Праграме трансгранічнага супрацоўніцтва „Польшча — Беларусь — Украіна 2007-2013", значыць, да „росту канкурэнтнасці прыгранічнага абшару" і запісу аб „лепшых умовах для прадпрымальніцтва". Сярод абшараў, якія маюць быць ахоплены падляшска-гродзенскім праектам, пакуль што агульна запісаны „супольныя ініцыятывы ў абсягу рэгіянальнага развіцця ды гаспадарчай і інвестыцыйнай прамоцыі" ды „паляпшэнне ўмоў развіцця бізнесу шляхам грамадска-гаспадарчага развіцця". Планаваны кошт праекта складае 1 млн. 200 тысяч еўра, з чаго ўласны пай партнёраў мае налічваць 20 працэнтаў. Урэшце, калі гаворка пра найбліжэйшую будучыню беларускай меншасці на Падляшшы, дык управа ваяводства таксама пры канцы старога года адобрыла размеркаванне грошай на рэалізацыю праектаў у галіне культуры і аховы нацыянальнай спадчыны. Аб дэталях напішам неўзабаве. Тым часам я толькі звярну ўвагу на тое, што зноў будуць дафінансаваны падляшскім самаўрадам абодва фестывалі царкоўнай музыкі (у Беластоку і ў Гайнаўцы; па 30 тыс. зл.), мерапрыемствы прымеркаваныя да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы, мерапрыемствы м.інш. БГКТ, Згуртавання „АБ-БА", Беларускага асветнага таварыства, дзеянні Беларускага гістарычнага таварыства і асяродкаў культуры ў Чыжах, Орлі ці Нараўцы. Адносна значныя грошы запланаваны на разбудову Звязам беларускай моладзі шляху „Дрэва і сакрум" (40 тыс. зл.). 6,5 тыс. зл. прызначана на стварэнне Падляшскім музеем калекцыі прац мастакоў беларускай меншасці ў Польшчы. Будуць мець падтрымку м.інш. вялікія мерапрыемствы такія як Свята беларускай культуры і Агульнапольскі фестываль „Беларуская песня". Агулам беларуская культура, прынамсі калі гаворка аб ліку дафінансаваных сёлета (пакуль) мерапрыемстваў, займае значнае месца ў ваяводскім бюджэце. Стасункі польска-беларускія, сярод іх падляшска-беларускія таксама — як мне пачало здавацца з канцом мінулага года — сталі набываць штораз большае значэнне. І няхай так будзе ў гэтым новым годзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Традыцыя і сучаснасць

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У царкоўным календары самым важным з'яўлецца святкаванне Хрыстовага Уваскрасення, але ў нас заўсёды многа ўвагі адводзілася Хрыстоваму Нараджэнню. Здаўна святкаванні Раства Хрыстовага суправаджаліся вельмі багатымі традыцыямі. Нашы праваслаўныя продкі ўспрымалі калядныя святы з вялікай радасцю і пашанай, а чарговыя вечары ажно да Хрышчэння Гасподняга называліся святымі. Аднак штораз менш традыцыі ў сённяшнім жыцці. Часта замяшчаюцца яны новымі „модамі" на святочны адпачынак. Практычна ад пачатку Філіпавага посту ў гарадах, а апошнім часам і ў некаторых гмінных цэнтрах паяўляюцца рознакаляровыя ілюмінацыі. Штораз часцей у большых мясцовасцях Новы год паводле грыгарыянскага календара сустракаюць на адкрытым паветры са спевамі, танцамі і гульнямі. У апошніх дзесяцігоддзях сталі таксама яшчэ ў час календарнай восені ўпрыгожваць у нас магазіны і ўстановы ёлкамі і рознакаляровымі дэкарацыямі. Модным стала купляць падарункі ўсім сямейнікам, хроснікам і сваякам, якіх плануем наведаць у святочны час, а ў масмедыях і на вуліцах гарадоў маняць нас разнароднымі рэкламнымі прапановамі. Стаянкі побач маркетаў перад святамі шчыльна запаўняюцца машынамі, як ніколі ў іншыя перыяды года, а пакупнікі часта мусяць доўга кружыцца паміж аўтамабілямі, покі дапхаюць вазкі, запоўненыя прадуктамі харчавання, цацкамі і іншымі таварамі пад сваю машыну. Нават у апошнія посныя нядзелі бегаем па магазінах і часта не хапае ўжо часу, каб зайсці ў царкву і памаліцца. У такіх выпадках усе ініцыятывы, якія вучаць маладых і старэйшых вяртацца да нашых традыцый, трэба ўспрымаць з радасцю і задавальненнем. Аднак пры гэтым добра ведаць, якія традыцыі былі ў нас ад стагоддзяў, якія паявіліся масава толькі ў другой палове мінулага стагоддзя, а якія прапановы нічога супольнага з традыцыямі не маюць.

Мода на ёлкі і падарункі прыйшла з захаду

Заўважальныя вонкавыя змены ў святкаванні Нараджэння Хрыстовага прыйшлі разам з паяўленнем ёлак у дамах багацейшых праваслаўных вернікаў. Хаця „мода" на ёлкі прыбыла на ўсход з Англіі і Германіі, то да нас ішла часткова з глыбі Расіі. Старажылы ўспаміналі, што першы раз убачылі ёлкі ў бежанстве, у Расіі. Бачылі на дрэўцах бліскучыя цацкі і гэта ім падабалася. Спачатку ёлкі паяўляліся ў беларусаў у гарадах, напрыклад, у Беластоку ці Бельску-Падляшскім. Некаторыя нашы бацькі прыбіралі ўжо ёлкі з дзяцінства, але ў многіх беларусаў з нашых вёсак ёлкі паявіліся ў хатах у пяцідзесятых і шасцідзесятых гадах, а то і яшчэ пазней, часта разам з малымі дзеткамі, якім бацькі клалі пад ёлкі падарункі і гаварылі, што іх прынёс Дзед Мароз. Я, напрыклад, з дзяцінства не памятаю, каб у нас гаварылася, што падарункі прыносіць Святы Мікалай, а сённяшнія пенсіянеры не памятаюць, каб увогуле якія-колечы падарункі даваліся ў час Божага Нараджэння. У некаторых багацейшых сямействах у мінулым давалі падарункі дзеткам у дзень памяці свяціцеля Мікалая, 19 снежня (6 снежня паводле старога стылю). Напрыклад, у маіх дзеда і бабулі, па маме, было разам ажно дваццаць хроснікаў і ў асноўным мае продкі заходзілі да гэтых малых дзетак толькі адзін раз у год (маю на ўвазе міжваенны перыяд), несучы на Вялікдзень або пасля яго „валачэбнае" (толькі размаляваныя яйкі). У час Божага Нараджэння падарункі і грошы ўручалі толькі калядоўшчыкам, а мода на падарункі ў час гэтага свята таксама прыйшла з захаду. Затое сённяшнія бабулі памятаюць, як пад святы Хрыстовага Раства галоўныя хаты прыбіраліся аздобамі з паперы і саломы, чаго няма ўжо сёння.

— У нашай хаце не ставілі ёлкі ні ў пяцідзесятых, ні ў пачатку шасцідзестых гадоў, але ў маім дзяцінстве прыбіралі ёлку ў нашых суседзяў і мне запамяталіся вялікія анёлы на дрэўцы. Мы сталі строіць ёлку ў канцы шасцідзесятых гадоў, калі ў нас было дзіцё, — сказала жанчына ў пенсійным узросце, што выводзіцца з Арэшкава. — Даўней перад Раством Хрыстовым упрыгожвалі мы вялікі пакой павуком з паперы, кветкі чаплялі побач ікон, а на сценах прымацоўвалі прыгожыя макаткі.

— У час майго дзяцінства і моладасці таксама не было ёлкі ў хаце. Пад столь вешалі мы павука з саломы, рабілі выцінанкі з паперы і ўпрыгожвалі хату макаткамі. Ёлка паявілася ў нас у канцы шасцідзестях гадоў, калі ў хаце пачынала падрастаць дзіцё, — успамінала амаль васьмідзесяцігадовая жанчына з Кляшчэлеўскай гміны. — У нашым наваколлі першыя ёлкі паявіліся ў царкве ў Орлі, а пазней пачалі ставіць і ўпрыгожваць ёлкі ў іншых храмах.

Апошнім часам выдатна паменшала колькасць калядоўшчыкаў, што наведваюць дамы і кватэры ў блоках; гарадскія дзеткі і моладзь штораз часцей сталі выступаць з калядкамі на сцэне

Калядавалі ад многіх вякоў

Інакш справа мелася з калядаваннем, якое ад вякоў было на нашых землях, а мяняўся толькі спосаб калядавання. Можна зараз прачытаць, як у больш адлеглым мінулым нашы продкі калядавалі з „казой" і іншай „звярынай" (самі пераапраналіся або насілі выявы звярыны на кійках), а пазней сталі масава хадзіць са звяздой і спяваць калядкі ў гонар Хрыстовага нараджэння. Частка з іх захавалася да нашых часоў, а нашы старажылы з настальгіяй успамінаюць калядаванне, калі яны былі яшчэ малымі жэўжыкамі і бегалі за старэйшай моладдзю, што хадзіла калядаваць з вялікай звяздой прыгожа абклеенай каляровымі выцінанкамі.

Побач запісвання калядак, у якіх славіцца нараджэнне Хрыста, збіраліся ў нас таксама калядкі з народнымі матывамі. Многа іх запісаў славуты наш фалькларыст Сцяпан Копа. Моладзь з „Жэмэрвы" і Музея малой айчыны са Студзіводаў пад наглядам Дарафея Фіёніка збірала таксама народныя калядкі з пажаданнямі маладажонам, нованароджанаму дзіцяці і яго бацькам. Можам заўважыць у іх многа матываў узятых з прыроды, а ў некаторых калядках зафіксаваны суадносіны паміж панам і мужыкамі. Сёння народныя калядкі маладажонам і малому дзіцяці спяваюцца толькі ў некаторых сёлах і найчасцей у выкананні старэйшых жанчын. Затое цяпер спяваецца яшчэ шмат калядак у гонар Хрыста, а калядоўшчыкі са звёздамі ходзяць па многіх нашых вёсках. Апошнім часам выдатна паменшала колькасць калядоўшчыкаў, што наведваюць нашы дамы і кватэры ў блоках; гарадскія дзеткі і моладзь штораз часцей сталі выступаць з калядкамі на сцэне.

Святкаванне па-старому і па-новаму

Покі нашы продкі дачакаліся святаў, стараліся па сваіх сілах і магчымасцях годна правесці пост. Апошнім часам штораз больш асоб стараецца ізноў пераходзіць на посную яду перад святамі Нараджэння Хрыстовага, згодна з нашымі традыцыямі, а паўсюдна нашы продкі і мы трымалі і трымаем пост у час Куцці. У асноўным адышлі мы ўжо ад варажэння ў час супольнай вячэры перад святамі і часта абмяжоўваем колькасць посных страў, што прапануюцца сямейнікам. Пачынаючы ўжо з часоў, калі нашы хлопцы і дзяўчаты пасля вайны сталі падавацца на пастаяннае жыхарства ў гарады, у нашых вёсках пачалі адыходзіць ад арганізавання Куцці толькі ў крузе адной сям'і, як было ў мінулым. Да бацькоў сталі прыязджаць па некалькі сямействаў дзяцей з унукамі і ў вялікай кампаніі сталі сядаць за посны стол у час Куцці. У больш адлеглым мінулым нашы продкі наведвалі сваіх сямейнікаў толькі ў час самых святаў Хрыстовага Нараджэння або ў Шчодры вечар (ноч перад Новым годам паводле юліянскага календара). Канешне, зараз практычна, калі маладыя наведаюць сваіх адзінокіх бацькоў перад святамі, дапамогуць падрыхтавацца да іх і супольна наладзяць Куццю, а то яшчэ і завезуць старэнькіх людзей у царкву ў іншую вёску. Калі аднак з бацькамі жывуць маладыя сямейнікі, то і нязручна ехаць да родзічаў нанач іншым сем'ям, бо часта няма дзе і пераначаваць. Можна ж Куццю падрыхтаваць у сваёй сям'і.

Многія традыцыі дапамагалі нашым дзядам і прадзедам дастойна падрыхтавацца да святаў і з радасцю ў сэрцы адсвяткаваць Раство Хрыстовае. Цяпер недахоп традыцый замяшчаецца новымі „модамі" і прапановамі. Праваслаўны вернік з Гайнаўкі заявіў, што добра было б правесці святы Божага Нараджэння ў цёплай краіне, а жанчына з гэтага горада сказала, што яна з мужам у час Раства Хрыстовага ходзяць на абеды ў рэстаран і не ездзяць у госці, каб там не праседжваць гадзінамі за сталом. Аднак, калі б мы святкавалі Божае Нараджэнне па-сучаснаму, у цёплай краіне, цяжка было б нам выбрацца на святочную багаслужбу ў царкву. Не наведалі б таксама сямейнікаў, суседзяў і сваякоў, а паставілі б на першым месцы ўласнае задавальненне. Хаця самымі новымі прапановамі карыстаецца ў нас яшчэ мала праваслаўных вернікаў, то яны ўсё ж такі распаўсюджваюцца. Яшчэ надалей у час святаў Раства Хрыстовага найчасцей наведваем мы сваіх бацькоў, калі тыя яшчэ ў жывых, спатыкаемся са сваімі сёстрамі, братамі і іншымі сямейнікамі. Хаця нашым страўнікам і нам лепш было б, калі б мы менш елі ў час святаў, дык цяжка абмежаваць нам беларускую гасціннасць. Нашы хроснікі вельмі рады падарункам, хаця гэта і не наша беларуская традыцыя. З казой мы ўжо не бегаем, а калядкі міла нам заспяваць або хаця б паслухаць, бо ўводзяць нас у радасны настрой святаў Нараджэння Хрыстовага.

Вучні вельмі рады перадсвяточным майстар-класам і паслясвяточным сустрэчам у школе або асяродку культуры

З сямейнага мінулага

Калі Чырвоная Армія гнала немцаў на захад, — успамінае Ірэна Машталеж, — каля Бельска і Відава адбыўся тады заўзяты бой. Пабітых немцаў пахавалі тады ў брацкай магіле каля ПОМу. Калі мы былі малыя, хадзілі туды глядзець на тую магілу, якая не была абгароджана, так як і цяпер.

Ірэна нарадзілася пад канец вайны ў сям'і Анны і Пракопа Фірсовічаў з Відава; была яна ўжо шостым дзіцём. Дзяўчынка расла здаровай, гуляла са сваімі сяброўкамі ў бэрка, чыжыка, хованкі... Хадзілі таксама ва ўрочышча Грабіна і часта іх там нешта страшыла і яны ўцякалі адтуль. Вучылася ў Падставоўцы № 1 па вуліцы Відаўскай, а пасля ў Агульнаадукацыйным ліцэі імя Касцюшкі. Вучыцца далей пайшла ў Беласток, у Школу медыцынскіх лабарантаў, якую завяршыла з добрымі ацэнкамі, здабываючы спецыяльнасць тэхніка-аналітыка. Чарговым этапам ейнай адукацыі стаў Заатэхнічны факультэт Сельска-Тэхнічнай акадэміі ў Ольштыне.

Пасля завяршэння навукі настаў час працы, якую яна пачала ў тамашнім вайсковым шпіталі. Там пазнаёмілася з лекарам Тадэвушам Машталежам, за якога выйшла замуж. Нарадзілася ў іх дачка, якой далі імя Кінга; хрысцілі ў царкве. Пазней Ірэна працавала яшчэ на Ветэрынарным аддзеле Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта. Ейны муж ужо памёр, а дачка Кінга завяршае вывучэнне фізікі і хіміі ў Варшаўскім універсітэце.

Ірэну бачу кожную нядзелю ў царкве, а пасля набажэнства вяртаемся яшчэ разам на аўтобусе. Размаўляем з сабою па-свойму, так як размаўлялі ў Відаве. Ірэна больш сарака гадоў жыве па-за роднай старонкай, але сваёй мовы не забыла, не выраклася, бо ад яе нельга адракацца ні ў горадзе, ні на вёсцы.

А ёсць жа і такія, што забылі сваю мову і не разумеюць ужо яе. Яны толькі надрываюцца ад работы, нават часу ў іх няма паслухаць слова Божае. Такія адыходзяць раптоўна з гэтага свету, так як і не жылі тут — ніхто пра такіх добрага слова не скажа.

Мой дзед, Раман Круталевіч, — успамінае Ірэна Машталеж, — нарадзіўся ў Відаве 17 лістапада 1887 года. У 1906 годзе закончыў ён Бельскае гарадское вучылішча і за выдатную навуку атрымаў узнагароду — зборнік вершаў Лермантава. Пасля прадаўжаў навуку на Землямерным аддзяленні Політэхнічных курсаў у Пецярбургу, якое завяршыў у 1914 годзе. У 1916 годзе дзедка быў мабілізаваны ў царскую армію, служыў у Арэнбургу і туды пераехала ягоная сям'я, у тым ліку і мая мама Анна, народжаная 21 ліпеня 1910 года.

Аднойчы ноччу, у 1918 годзе, дзедка, у суправаджэнні іншых салдатаў наведаў дом, каб пабачыцца з жонкай і дзецьмі. Калі выйшаў, напалі на іх чырвонаармейцы, было чуваць стралянiну; з таго часу дзедка больш дома не з'яўляўся. Бабуля Галена шукала яго ўсюды, але дзедаў след прапаў. Пасля іхні дом захапілі бальшавікі, дазваляючы бабулі з дачушкамі жыць у адным толькі пакоі. Калі ў 1921 годзе настаў вялікі голад, бабуля з дзецьмі вярнулася ў Відава.

Запісаў Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Непагасны боль чыстага сэрца: Петручуковы „Крышынкі"

Васіль Петручук, родам з Грабаўца, народжаны ў 1926 годзе, адзін з самых старэйшых дзейсных беларускіх літаратараў. З'яўляецца сябрам Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", Саюза беларускіх пісьменнікаў Беларусі, Саюза польскіх пісьменнікаў. Ён і публіцыст, грамадскі дзеяч. Аўтар аповесці „Пожня" (Беласток, 1987; Мінск, 1991; па-польску выйшла ў 1986 г.), зборніка апавяданняў „Клавуня, гэта я, твой Вася" (Беласток, 1998) і кнігі „Księga hańby" (Беласток, 1995, 2006). У падрыхтоўцы да друку кніга ўспамінаў „Blizny". Найнавейшае выданне „Крышынкі" — успаміны і выбар апавяданняў — сямідзесятая кніга серыі Бібліятэка БЛА „Белавежа", выдадзеная на кошт сродкаў Культурнага цэнтра Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча (сёлета КЦБ падтрымаў выданне чарговых трох кніг беларускіх пісьменікаў з Беласточчыны).

— Напішы ў эпілогу так мае словы: *Няхай бязвольныя дурні і трусы на наракаюць на свой лёс!* — патрабаваў ад мяне, як рэдактара выдання, аўтар. А тут і эпілогу няма, і словы гэтыя не пасмела я напісаць — мелі яны абагуліць усё напісанае сівавалосым добрым, прыгожым і таленавітым чалавекам, якога ўсё ж не зламаў лёс. І не зрабіў яго бязвольным і трусом. І не адабраў у яго чысціні і дабрыні сэрца, не забрудзіў яго. Ягоныя кнігі чытаюцца як вечная элегія па страчанай маме, якая не кончыцца эпілогам. Благім ці добрым. Бо ўзнагароды і званні ад людзей, павага для Васілька, які ніколі не адрокся свайго беларускага імя і адважна змагаецца за важныя для яго каштоўнасці, а які да гэтай пары застаўся ўражлівым хлопчыкам сярод пташак, звяроў і добрых — усё ж — людзей — не вернуць яму таго, што страціў: дзяцінства сярод прыязных, спагадлівых, людскіх людзей. Я гэта адчула і зразумела стоячы пры магіле ягонай вечна маладой мамы Ганны Петручук на дубіцкім могільніку. Наўкол яе пакояцца людзі — героі балючых занатовак Васіля Петручука.

Крышынкі болю, пяшчоты, захапленняў... Ці запісаныя словы змогуць стаць замовай, лекам на ляк і не помстай? Не ад аднаго сябе піша ўспамін Васіль Петручук, не толькі, дарэчы, ад людзей. Чытайце, маладыя і немаладыя, як было. Васіля Петручука ўсё ж турбуе адна думка. Што трактавалі яго заўсёды як недарэку, што па сваёй натуры не даў сабе рады з гэтым жорсткім светам. Разважае горка: „Чалавек ёсць дурным не толькі тады, калі не ўмее вынайсці дынаміту, зрабіць бочку, кола, паняць алгебру, трыганаметрыю, вывучыць на працягу года кітайскай мовы, але тады, калі не зможа ў жыцці справіцца з перашкодамі, якія яму падкідвае тое самае ўласнае жыццё і акружаючыя яго людзі. Чалавек, які мае нарадзіцца з мяккім розумам і такім самым сэрцам, дык няхай адразу пры родах памрэ. Бо жыцця, якое павінна належаць нармальнаму чалавеку, ён мець не будзе. І то з тае простае прычыны, што ён сабе з нічым не дасць рады, бо яго розум не падкажа, то і мяккае сэрца не падтрымае таго, бо яны адно аднаго не раяцца, не спрачаюцца і не ратуюць. Бязвольны чалавек жыве чужым розумам і ўсім падпарадкоўваецца — становіцца папіхайлам. Хоць бачыць крыўду і ведае, што яму кепска, а ўсё роўна не шукае спосабу, каб сабе зрабіць лепш... Я не ведаю, да якой групы дурняў прылічыць сябе, глядзеўшы з перспектывы сваіх гадоў. Бо на свае цяжкія перажыванні, на сваю долю тую аб'ектыўную, якую нясе жыццё, якую падкідваюць блізкія людзі (пра чужых не гавару, бо часта яны лепшыя ад сваіх) тыя неўдалоты па-рознаму адносяцца; адны ў розны спосаб адымаюць сабе жыццё, другія становяцца замкнутымі ў сабе і дажываюць жыццё як дзівакі; трэція ідуць у свет, што ў нас называлі „пушов у блуд", чацвёртыя спяваюцца, што называецца „топ'ят горэ ў горыэлці". І ўсе яны, мы, маем выгляд і форму чалавечую. Хоць не ведаю ў тым выпадку, які павінен быць чалавек ідэальны, або хоць напалову ідэальны, бо людзей ідэальных напэўна няма. Першаю і, здаецца, асноўнай маёй дурнотаю было тое, што хадзіўшы галодным, не краў у людзей, асабліва ў дзеда не толькі хлеба, але і што трапілася. А чаму я ад радні і мамы не патрабаваў есці хоць тады, калі пасвіў іхніх кароў? А чаму саромеўся папрасіць? Тут, праўдападобна, адыграла ролю тое, што калі ў мачахі не папрасіў хлеба з соллю на двор, бо бачыў, што чужыя дзеці так робяць, то заўсёды чуў, што „есты не сраты, можна пождаты" або даставаў такую дулю пад нос, што часам аж падаў. Бо тая дуля не была толькі як у пагаворцы: вялікі палец укладзены паміж указальным і сярэднім памагаў дулі збіць мяне з ног. Пасля такога калі асмелішся папрасіць у чарговы раз?.."

Кніга пісалася на грабавецкай, роднай гаворцы, лацінкай. Тут пэўна параіў бы Ян Максімюк, каб запісаць яе ў граматыцы, якую прапануе для запісу „свае мовы". У кнізе стараліся захаваць яе хоць у дыялогах. Вядома, здарыліся і памылкі. Прабачце, дзядзя Вася, за картохлю і смужа, суседа Бонохвацюкоў, і тую дату, калі вы сталі віцэпераможцам у меткім стралянні ў „Гвардыі" якраз у 1954 годзе, а не ў іншым. Меткая Ваша кніга, трапляе ў сэрца, душу, паказвае былое і тое, як быць моцным беларусам.

Міра ЛУКША

Васіль Петручук, *Крышынкі*, БЛА „Белавежа", Беласток 2009, 170 с.

Ірына Юрчук

нарадзілася ў 1956 г. у вёсцы Макаўка. Пачатковую школу закончыла ў Нарве, затым паступіла ў белліцэй у Гайнаўцы. У 1977 г. стала студэнткай беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта. Магістэрскую працу пісала на тэму „Фальклор і абраднасць вёскі Макаўка". Працавала ў школах у Янове, Гародчыне і ў Нарве. Цяпер пенсіянерка і займаецца ўнукамі.

Ірына Юрчук

Маме

Мне з Табою
было так цёпла
бестурботна і бяспечна
Ласка твая
атуляла мяне
Твой позірк
быў сэрцам
а каханне цёплае
як сонечнае праменне

* * *

Ты адышла
А я не патрапляю
з гэтым пагадзіцца
І толькі слёзы
ціснуцца да вачэй
Падаюць адна
за адной...
цяжка...
балюча...

* * *

Без Цябе
пуста і сумна
І хаця
Ты адышла
для мяне
заўсёды будзеш жывая...
...
Я кахаю Цябе
душою сэрцам словам

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

Албанія — забытае месца Еўропы (2)

Экспрэсам па Албаніі

Паколькі камуністы змагаліся з рэлігіяй у кожнай краіне на свой спосаб, дык албанскія асабліва люта. У 1967 г. па загадзе „таварыша каменданта" Албанія была аб'яўлена першай атэістычнай краінай свету. Для прыкладу: з ліку 1 050 мячэцей 200 было разбураных адразу, астатнія заменены ў склады і іншыя публічныя аб'екты, а літаральна некалькі захаваліся як помнікі мінуўшчыны, а не рэлігійныя аб'екты. Падобны лёс сустрэў 1 600 праваслаўных цэркваў. А духоўныя, нягледзячы на веравызнанне, фізічна перасталі існаваць. Трапілі ў вязніцы і лагеры працы. З ліку двухсот айцоў-настаўнікаў бекташаў (па-албанску „бабаў") перыяд атэізацыі перажыло пяцёх. А праваслаўных святароў пры жыцці засталося дваццацёх, і што горш, ніводзін не мог стаць епіскапам. Трэба было шукаць іх за мяжою, але гэта не было так проста. Албанскае кіраўніцтва пад уплывам нацыяналістычных колаў супрацьлялася імпарту праваслаўных святароў, асабліва з Грэцыі. Нават тым епіскапам, назначаным Усяленскім Патрыярхам, улада ў Тыране адмаўляла ў візах. Але тыя не здаваліся. Ужо ў 1992 годзе ў Дурэсе пачала працу праваслаўная духоўная семінарыя. Іслам адраджаўся без большых перашкод арганізацыйнага характару. Самая толькі Саўдаўская Аравія прафінансавала пабудову 500 мячэцей.

Паколькі шлях у Еўропу вядзе цераз Італію, дык і рымска-каталіцкая царква адраджалася хутка і не так складана як праваслаўная. У 1992 годзе Албанію наведала маці Тэрэза, найбольш у свеце вядомая албанка, а год пазней душпастырскі аднадзённы візіт нанёс Ян Павел II. Папа аднавіў каталіцкую іерархію, стварыў дыяцэзіі. Менавіта малітоўная сустрэча з Янам Паўлам II праходзіла ў Шкодэры.

Сёння ў краіне з насельніцтвам у тры з паловай мільёна чалавек 10% складаюць каталікі, 18-20% — праваслаўныя і 65% — суніты і бекташы. Але гэта статыстыка. Хутчэй за ўсё адносіцца яна да паходжання па веравызнанні, бо ўзровень рэлігійнасці, дзякуючы сумнай атэізацыі, не аж такі вялікі. Дарэчы, гэта мае і станоўчыя бакі — не аж так ужо актыўныя рэлігійныя фанатыкі, зрэдку чуецца пра міжканфесійную варажнечу. А на вуліцы жанчыны ў хустках гэта рэдкасць, пра закрытыя твары не гаворачы. Албанскі варыянт ісламу мо і не ўсхваляе спіртных напояў, але, здаецца, і не забараняе. Нават калі муэдзін заклікаў на малітву, людзі ў кавярнях папівалі сабе каву і ракію. Кава тут — як напой — на першым месцы. Некаторыя выпіваюць па 10-12 філіжанак кавы па-турэцку, значыць, моцнай і салодкай. Таму, робячы заказ афіцыянтцы, трэба сказаць, што хочаш каву без цукру, бо як правіла прынясе салодкую.

На жаль, усе экскурсіі маюць загадзя распланаваны рэжым наведвання. Найчасцей такі: музей, сабор (або іншы сакральны аб'ект), старажытныя руіны, зрэдку мясцовы базар і пару хвілін свабоднага часу. Так было і гэтым разам. Гістарычны музей з багатай археалагічнай калекцыяй мала каго зацікавіў. Большую ўвагу прыцягнула спрэчка паміж экскурсаводкамі. Была з намі польская і чарнагорская гіды. Албанцы запрапанавалі дзве свае. Адна, старэйшая, распавядала па-албанску, другая перакладала на сербскую мову, а ўжо нашай — на польскую. Як потым высветлілася, кожная хацела падзарабіць, і тыя дзве албанскія, і чарнагорская.

— Ну вось, адкуль узялася Албанія (*Shqiperia* па-албанску)? — гаварыла экскурсаводка ў музеі. І давай разводзіцца пра далёкае мінулае. Сённяшнія албанцы, паводле яе, нашчадкі албанскага люду двухтысячагадовай даўнасці — ілірыйцаў, але ўжо Шкодэр заснавалі рымляне ў III стагоддзі нашай эры. Доўгі час знаходзілася яна пад уплывам Візантыі, Венецыянскай Рэспублікі, а потым асманскіх туркаў. Недалёкі замак — Розафа — доўгі час абараняўся ад іх, толькі калі іх нашэсцем кіраваў сам султан Мехмед II у 1479 г., узялі яны цытадэль. З таго часу паходзіць нацыянальны герой Албаніі Георгій Кастрыёці, якога называлі Скандэрбегам у час яго пабыўкі ў Канстанцінопалі. Быў ён каталікам, як і значная частка албанцаў. Змагаўся з мусульманамі. Нават гаворыцца, што ў адной з бітваў спыніў мусульманскае нашэсце на Еўропу. Інакш кажучы, каб не ён, дык і сённяшняя Еўропа была б пад ісламскім уплывам. Тое ж самае палякі гавораць пра караля Яна III Сабескага.

Па дарозе ў Шкодэр. Праваслаўная царква — характэрнасць пасля 1991 года

Вуліца ў Шкодэры

Сцяг сённяшняй Албаніі — чорны двухгаловы арол на чырвоным фоне — гэта быў сімвал-сцяг Скандэрбега. Падмацаваныя такімі ведамі падаліся мы ў замак Розафа. Па дарозе памянялі грошы, нашы еўра на іхнія лекі (1 еўра = 300 лекаў). Але як потым аказалася, у кафэ, барах, на пошце і на вуліцы можна расплачвацца еўра. На жаль, кантораў абмену валюты як такіх няма, грошы трэба было мяняць у банках або ў вулічных мянялаў, яшчэ так нядаўна прысутных і на нашых вуліцах. Замак распаложаны на горцы, з трох бакоў аблівaюць яго рэчкі: Дрын, Кіры і Буна (гэтая апошняя па-сербску называецца Бояна) і Скадарскае возера. Таму мо і не так цяжка было яго ўзяць. Дарэчы, так албанскія, як і чарнагорскія тураператары прапаноўваюць турыстам лодачны паход (ад возера ў Адрыятычнае мора) па гранічнай Бояне. Але на гэта ўжо нам не хапіла часу. На жаль, не мелі мы часу і на іншую цікавую экскурсію — арніталагічную. Скадарскае возера вельмі багатае ў птушак, таксама і пералётных. На тутэйшых балотах можам знайсці пелікана, баклана, чаплю і цыранку ды дзесяткі іншых, якіх назваў і не ведаю. А ведаю, што некаторыя з іх занесены ў „Чырвоную кнігу". Маё апраўданне такое: я быў там пры канцы вясны, а за пералётнымі птушкамі найлепш назіраць узімку.

Затое на зыходзе вясны, скажам, у траўні, найлепшы час для наведання Албаніі. Яшчэ не так горача, але ўжо цёпла.

(працяг будзе)

А ну іх з тымі лавачкамі!

На вуліцах Беластока на аўтобусных прыпынках гарадской камунікацыі стаіць шмат міні-пачакальняў у выглядзе дашкоў. Навейшых і старых. Тыя апошнія знаходзяцца перад усім на перыферыях горада, між іншым, на апошнім аўтобусным прыпынку па вуліцы 27 Ліпеня, побач цяпліцы. Зараз у цэнтры горада паставілі новыя, напрыклад, па вуліцы Сянкевіча.

Неаднойчы прыйшлося мне чакаць „свайго" аўтобуса з нумарам „13" і прысесці на лавачку пад дашком на прыпынку ў пачатку вуліцы Сянкевіча. Сеў ды праз некалькі хвілін устаў — азадак забалеў. Не адзін толькі я так заседзеўся! Жанчыны і тыя жвавенька сарваліся на ногі. Справа ў тым, што тут лавачкі з трох вузенькіх дошчачак-дручкоў. Прысядзеш, і яны так і ўпіваюцца ў мяккае месца, косці муляюць. Вось табе і на! Не пасядзіш, месца ўступіш. Зрачэшся быццам бы лавачкі, хаця многа пахадзіў і ногі забалелі.

Хто яго ведае, можа майстры робяць лавачкі-валкаўніцы з акрэсленай мэтай: каб ніхто не заседзеўся і не праваронію „свайго" аўтобуса. Моў ведайце: гэта не лавачка на паркавай алейцы, на якой і задрамаць можна.

Што ў 2010 годзе?

Лепшыя новыя маставыя атрымаюць вуліцы і дарогі на **Гайнаўшчыне**. І так, між іншым, вуліца Каляёвая, Паркавая і Вашкевіча ў Белавежы; вуліца 11 Лістапада ў Гайнаўцы; вуліца ў Прагалях (Гайнаўская гміна); вуліцы Новая і Міцкевіча ў Нараўцы ды адрэзак зараз яшчэ жвіроўкі з Заблотчыны ў Мінкоўку (Нараўчанская гміна); дарога з Кляшчэляў у Палічную; дарога з Трасцянкі ў Пухлы (Нарваўская гміна) ды дарога са Збуча ў Мора (Чыжоўская гміна).

У **Міхалоўскай гміне** будуць адноўлены дарогі ў бок шасэйных шляхоў у Старую Луплянку, у Ніжнюю Таніцу, з Міхалова ў Капцы ды палова дарогі з Геранімова ў Гозьну цераз Патоку.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Узнагарода

22 снежня 2009 г. бурмістр Гайнаўкі, разам са сваім намеснікам, узнагародзілі двух функцыянераў Павятовай камендатуры паліцыі з патрульна-інтэрвенцыйнай секцыі за тое, што пасля службы затрымалі двух злачынцаў — зладзеяў дарожных знакаў, пра што я пісаў у „Ніве" № 49 ад 6.12.2009 г. Узнагароджаныя атрымалі ў падарунку электратэхніку. Кіраўнікі самаўрада падзякавалі паліцэйскім за прыкладную паставу і павіншавалі іх з узнагародай ды пажадалі поспехаў у штодзённай службе і сямейным жыцці.

Узломшчык

Лясная прымаўка гаворыць: „Цягаў воўк, пацягнулі і воўка". Так было і ў Гайнаўцы. Ноччу з 25 на 26 лістапада 48-гадовы злачынца разбіў шыбу ў дзвярах крамы па вуліцы Белавежскай і забраў тавары (гарэлку, піва і папяросы) вартыя каля тысячы злотых. Чарговай ноччу гэты ж асобень паспрабаваў пранікнуць у наступныя тры магазіны, прытым і ў раней абакрадзеную ім краму. Дзякуючы сігнальнай тэхніцы ў крамах і пільнасці грамадзян злачынца быў затрыманы паліцэйскімі. **(ус)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Вечнамаладыя калядкі

Калі ў Бельску калядуе „Жэмэрва", людзі пытаюць у маладых каляднікаў:

— *А што то Вы такія сучасныя калядкі спяваеце?!*

Каляднікі ўсміхаюцца. Яны не спадзяваліся такой пахвалы, наадварот, калі развучвалі старажытныя калядкі-канты, думалі: „папракнуць што... старыя".

Старажытнабеларускія калядкі, бо пра іх мова, нягледзячы на стагоддзі, уражваюць свежасцю і моцным духам. Ад іх цяплей становіцца на душы, ясней у галаве. Радуюцца каляднікі, радуюцца слухачы... Праўда, іх не вывучыш на хаду. Найгорш запамятаць тэкст. Часам такі твор мае да сарака зваротак. І звычайна яны на старажытнацаркоўнаславянскай мове, якая, хоць блізкая па душы, не заўсёды зразумелая. З мелодыяй таксама складана. Аднак, калі ў групе добры запявала, старыя калядкі спяваюцца лёгка і „самі". Я сама памятаю, як нейкія дзесяць гадоў таму разам з рэдакцыяй часопіса „Бельскі гасцінец" мы хадзілі з калядой па сяле Аўгустова, што каля Бельска. Большасць калядак,

напрыклад, „Цвет нетленный" або „Днесь от Дзевы" мы заспявалі без падрыхтоўкі. Але яны запамяталіся. На другі год іх успрымалі як добравядомы жалезны рэпертуар. Калі пра падборку, у нашым рэпертуары было больш за дзесяць старажытных калядак-кантаў. Іх выдатна папаўнялі калядкі на мове нашых вёсак, часта з пажадальным зместам...

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Таму, самым прыгожым падарункам пад ёлку з'яўляецца для мяне кампакт-дыск „Староб'елорускі кол'ядкі з Пудл'яшша", які выдаў Музей малой айчыны ў Студзіводах напрыканцы 2009 года. На дыску 19 калядных твораў, у тым ліку архіўныя запісы з вёсак Стрыкі (1979), Дашы (1990), Крывец (2006). Канты спяваюць вядомыя этнагурты — „Каліна" з Дашоў, „Крыўчанкі" з Крыўца, калектыў з Дабрывады, спявачая група з Сухавольцаў. Чатыры творы выконвае маладая „Жэмэрва" са Студзіводаў і Бельска. На дыску сустрэнем асаблівы запіс „Многага лета". Пажаданне спяваецца на падляшскі манер, які паўсюдна спявалі ў цэрквах і ў час сямейных застолляў... Разам з дыскам — спеўнік (на жаль, без нотаў).

Запіс калядак-кантаў зроблены па ўзору рукапісу Цімафея Садоўскага з Тыневіч-Вялікіх. У ягоным рукапісным багагласніку з міжваеннага часу XX стагоддзя, які складае каля тысячы старонак, занатаваны 52 калядныя канты. Большасць з іх, на жаль, ужо забыты.

Вокладку дыска аздабляе святыня: ікона Божага Нараджэння з XVII ст., якая знаходзіцца ў Васкрэсенскім саборы ў Бельску-Падляшскім. Дыск можна набыць у цэрквах і ў рэдакцыі „Нівы".

ЗОРКА

Алена Кобец-Філімонава

Мароз, Чырвоны нос

Калісьці Мароз быў вельмі падобны да Дзеда Мароза, якога ставяць пад навагодняй елкай. І Мароз так любіў дзяцей, што нават не шчыкаўся. Але дзеці з яго насміхаліся, бо ў яго быў чырвоны-чырвоны нос. Як убачаць дзеці, што Дзед Мароз ідзе, бягуць за ім і прыгаворваюць: «Дзед Мароз, Чырвоны нос! Дзед Мароз, Чырвоны нос!»

Так яны дражнілі Дзеда Мароза, пакуль той не на жарт раззлаваўся. Аднойчы Дзед Мароз надзеў на галаву Шапку-няўгледку, узяў чырвоную фарбу, пэндзлік і пайшоў па вуліцах. А дзеці не ўгледзелі, што Дзед Мароз ідзе. Макнуў Дзед Мароз пэндзлік у фарбу і пафарбаваў усім насы.

З той пары ён і ходзіць няўгледкам. А калі ў цябе зашчыкае нос, дык ведай — гэта Дзед Мароз яго ў чырвоны колер пэндзлікам фарбуе.

Не верыш? Паглядзіся ў люстэрка.

Плютычы

Гаворачы пра паходжанне назвы вёскі Плютычы, распаложанай у гміне Бельск-Падляшскі, сустрэць можам дзве версіі. Першая з прадстаўленых жыхарамі версій гаворыць, што некалі мясцовасць наведаў жаўнер са званнем плютановы. Паколькі жыхары мясцовасці вельмі яго палюбілі, вырашылі ў такі спосаб назваць сваю мясцовасць. Другая версія тлумачыць, што назва выводзіцца ад слова „плюта", што абазначае асобу, якая вельмі шмат гаворыць.

Плютычы існавалі ўжо ў XVI стагоддзі. Пасля валочнай памеры, якая прайшла у гэтым жа стагоддзі, вёска стала цэнтрам войтаўства.

Пры канцы XIX стагоддзя ў Плютычах існавала школа. У міжваенны перыяд бацькі і дзеці намагаліся стварыць тут беларускую школу, на жаль, не дасягнулі гэтай мэты. Пра тое, як важнай жыхарам Плютыч была іх малая бацькаўшчына, можа сведчыць тое, што ў першых гадах пасля II сусветнай вайны стварылі яны групы самаабароны, каб бараніць вёску перад зладзейскімі групоўкамі, якія ў той час былі вялікай пагрозай для беларускіх вёсак Падляшша.

Па сённяшні дзень у Плютычах жывуць народныя майстры, якія займаюцца ўпрыгожваннем хат. Варта тут адзначыць, што паяўленне архітэктурнага аздаблення, так характэрнага падляшскім вёскам, было б немагчымым, калі б не з'явіліся адпаведныя тэхнічныя ўмовы для яго выканання. Гутарка ідзе пра рамавую пілу з вузкім лязом, якое давала магчымасць дакладна вырэзваць дэталі. Тэхніка выканання аздоб абапіралася на выкананне шаблонаў, трафарэтаў, з дапамогай якіх на дошку алоўкам наносіўся ўзор. Выкарыстанне такіх шаблонаў мела вялікі ўплыў на форму выконваных аздоб, якія характарызаваліся сіметрычнасцю аздобных элементаў. Выкарыстанне шаблонаў тлумачыць таксама паўтаральнасць асобных элементаў у працах таго ж майстра. Аздобныя дэталі сталяр выконваў у восеньска-зімовы перыяд, калі меў больш вольнага часу. Часта выкананнем аздоб займаўся іншы майстар, не той, які ставіў дом, а той, чые ранейшыя аздобныя працы прыйшліся даспадобы гаспадару.

Калі ідзе пра характэрны Плютычам узор упрыгожвання хат, найчасцей сустрэць можна тут узор конікаў.

Міхась СЦЕПАНЮК

Галерэя Зоркі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Марыянна Садоўская.
2. Твой любімы прадмет: польская мова.
3. У жыцці хачу стаць: не ведаю, усё мяняецца.
4. У сяброў цаню: шчырасць.
5. Не люблю: плакаць.
6. Па-беларуску размаўляю: з сяброўкай.
7. Кніжка, якая мяне захапіла: „PS. Кахаю цябе".
8. Падабаецца мне музыка: рок-н-рол, джаз.
9. Люблю размаўляць: з сястарой, братам, мамай, сябрамі.
10. У „Зорцы" падабаецца мне: пачуццё гумару.
11. Чаму: я люблю пасмяяцца, нават з самой сябе.

Гэта справа эмоцыі!

З Марыяннай САДОЎСКАЙ з Храбустоўкі, што каля Нарвы, лаўрэаткай Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы, гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК

— ***Прывітанне, Марыянка! Прыемна Цябе бачыць сярод лаўрэатаў. Ты, здаецца, ужо чарговы раз прыступіла да конкурсу?***

— Другі раз.

— ***Зараз ты вучаніца...***

— II Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку.

— ***Падтрымліваеш сувязі з беларускай мовай?***

— Гэта складаная справа. Мой кантакт з мовай у Беластоку моцна абмежаваны, часам чытаю „Ніву". Я адчуваю, што беларуская мова — гэта справа эмоцыі. Я не хачу яе забыць. Таму пішу.

— ***Пра ўсё,што Табе баліць?***

— Можа скажу так: я пішу пра тое, што для мяне самае важнае. У прынцыпе, усе мае вершы пра бацьку або для бацькі.

— ***Колькі гадоў яго няма ўжо сярод жывых?***

— Шэсць гадоў.

— ***Кажуць,час гоіць раны...***

— Я не скажу, што плачу па ім кожную ноч. Я проста думаю пра яго, памятаю. Размаўляю з ім у думках, раюся ў праблемах. А пасля мушу гэта запісаць на паперы...

— ***Мусіш?***

— Так. Думкі знікаюць. Я пішу, каб яны жылі, каб бацька ведаў, што я пра яго думаю, памятаю.

— ***Гэта класна! Ведаю, што беларускай мове Ты пачала вучыцца пазней чым Твае аднагодкі. Бачу таксама тут добрую руку настаўніцы Ніны Абрамюк.***

— Гэта праўда. Карыстаючыся нагодай, перадаю ёй прывітанні і дзякую за ўсё. Яна сапраўды адкрыла мяне на беларускую мову. Зараз я вывучаю яшчэ французскую, англійскую, рускую мовы, але беларуская для мяне з'яўляецца самай дарагой, як памяць пра майго бацьку.

— ***У апытальніку Ты напісала, што яшчэ не ведаеш кім хочаш стаць у жыцці, бо ўсё мяняецца. Якія ў Цябе зацікаўленні на сённяшні дзень?***

— Цікавіць мяне тэатр. *(Марыянка з трывогай спазірае на гадзіннік, пасля просіць прабачэння)*. Прабачце, мне трэба бегчы... У мяне ўжо пачаліся рэпетыцыі...

— Ну, дык спяшыся! І поспехаў на сцэне!

— *Nie dziękuję.*

Музыка з кайфам

На новы год

Пачатак года спрыяе планам (так як яго канец служыць падвядзенню вынікаў і падсумаванням усялякага роду). Калі гаварыць пра беларускую сцэну, то ў Беларусі трымаецца яна моцна. Сведчыць пра гэта цікавы праект „Тузін. Перазагрузка". У рамках гэтага праекта выканаўцы, якія штодзень спяваюць па-руску, часам займаюцца кар'ерай перш за ўсё ў Расіі, у гэты раз праспявалі свае гіты на беларускай мове. У выніку з'явіўся альбом і, як адзначаюць аўтары праекта, мабыць будзе працяг. Напэўна ў гэтым годзе не змоўкне рэха папулярнасці нарвежскага беларуса Аляксандра Рыбака, які карыстаецца павагай розных пакаленняў, слухаюць яго і мамы, і дочкі. Ёсць і беларуская альтэрнатыва, якую чулі ўжо за акіянам. Можа не да ўсіх дайшла яшчэ хвала і слава гурту „Ляпіс Трубяцкой", але кажу: варта запомніць гэтую назву. Беларусы, якія часцей спяваюць на рускай мове, былі ў мінулым годзе прызнаныя лепшым расійскім альтэрнатыўным рок-гуртом! Важнае, што ў сваім рэпертуары множаць яны беларускія песні. Забыла б пра „The Toobes"! Гурт так моцна спадабаўся брытанскаму кампазітару і прадзюсару Трыкі (Tricky), аднаму з заснавальнікаў жанру трып-гоп, што беларускія хлопцы праўдападобна запішуць свой альбом у гэтага славутага музыка. Вось такія поспехі і шырокія планы.

А што на Падляшшы? Рыхтуюцца два альбомы. Народны калектыў „Маланка" працуе над сваім музычным выданнем, а альтэрнатыўны „ILO&friends" у палове года прадставіць свой другі альбом. Варта дадаць, што і дзеці з беларускага садка ў Беластоку будуць запісваць свой альбомчык пры дапамозе дарослых. Можа гэта не так шмат, як бы чакалася ад нашага Падляшша, якое ў 1990-х гадах квітнела беларускім рокам. Але якія часы, такі настрой. Або няма зацікаўлення ў беларускай музыцы, або няма людзей, якія б умелі самастойна складаць музыку, ды яшчэ на беларускай мове! А да гэтага трэба сябе ўзаемна выхоўваць, таму... заглядайце ў „Зорку"!

i_basovka@o2.pl

ЧОРНА-БЕЛЫЯ ДУМКІ

Дэ Двэры?

Дэ Двэры, дзе **Вядро**, дзе **Брага**, дзе **Кардон**... Дзе гурты з Падляшша? Стаўлю сабе пытанне пасля апошніх „Басовішчаў", а таксама пасля „Бардаўскай восені". Я не падзяляю радасці маладога падляшскага паэта што гуртоў, якія граюць беларускія песні, каля трыццаці. Гэта або фальклор, або гурты, якіх выступальнай пляцоўкай з'яўляецца клуб „Прэм'ера" ці залы, дзе гурты пускаюць музыку з CD-дыскаў. Хтосьці скажа: *народ гэтага патрабуе, добра, што хоць гэта ёсць*. І гэта таксама праўда. Але трэба новага подыху. Шкада, што **Белы сон** ужо не дзейнічае. Адна **Ілоі фрэндс** падымае душу, але гэтага мала. Успомненыя на ўступе гурты дзейнічалі ў добры час, калі моладзь іграла па гаражах. Сустракаліся двух хлопцаў: *Давай зробім гурт!* Ідзе трэці: *Прывітанні! Ты на чым іграеш?* — пытаюць. — *Я... на нічым*, — адказвае ён. — *Добра, будзеш іграць на бубнах.* Так, між іншым пачаў сваю гульню ў музыку бубнач вядомага не толькі ў Гайнаўцы **Белага насарога**. Амаль кожны хацеў іграць. Што хоча цяперашняя моладзь? Няўжо толькі *фуру, шкуру і камуру?*

зм

Польска-беларуская крыжаванка № 2

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 50:

Неба, як, лук, ар, камар, ара, зорачка, павук, Ася, Ас, дзік. Ваяк, каза, мова, беларус, бурак, мак, аказ, карасі, ліра, як.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Івона Анішчук** з Дубін, **Магда Магрук, Віялета Дработа, Эвеліна Самасюк, Паўліна Паплаўская, Адрыян Антасюк, Габрыель Кузьміч** з Бельска-Падляшскага, **Малгажата Гаворка, Паўліна Юрчук** з Гайнаўкі. Віншуем!



Паэзія ў сучасным свеце

Паэзія гэта прыватны сусвет кожнага паэта, а таксама спосаб успрымання гэтага свету цераз прызму яго тонкасцей. Так як кожная творчасць, так і паэзія з'яўляецца адарваннем творцы ад ахінаючай яго рэчаіснасці, часта для яго незразумелай. Твор гэта спосаб адказу на пытанне чаму ў знешнім свеце горш, чымсьці ва ўнутраным, створаным фантазіяй паэта. Паэзія — духовая тэрапія для творцы, якая ў чытача шукае спагады. Добра, што ў паэта ёсць крыху чытачоў, бо гэта сведчыць, што знаходзіць зразуменне ў акружаючым асяроддзі. Пэўна ж кожны шукае аднадумцаў, якія зразумеюць пачуцці творцы, пераказаныя ім у вершы ці паэме, бо гэта ж мае сэнс. Часта бывае, што паэт не знаходзіць зразумення ў знешнім свеце ды часта ўцякае ў дрэнную звычку або часам хоча перамагчы самога сябе, губляючы жыццё, а ўзамен атрымліваючы несмяротнасць у наступных пакаленняў і вырываючы іх з абыякавасці. Ці тое ж думалі Эдуард Стахура ці Рафал Ваячак, не знаходзячы сябе ў чорна-белай рэчаіснасці пасляваеннай Польшчы? А ці зараз паэты адчуваюць сябе свабоднымі ў тым, што хочуць нам пераказаць і ці ўвогуле хтосьці хоча іх слухаць? Тут не заб'ешся для народа, бо кожны чалавек другому патрэбны і, вядома ж, шкада жыцця. У сучасным камерцыялізаваным свеце, скажам, няма месца для паэзіі. Здаецца, жывем у часах скарацечнай інфармацыі, таннай попкультуры і дарэмнай сенсацыі. Але ці гэта нас не расчароўвае? Думаю: калі чалавек мае ў сабе нотку ўражлівасці і веды пра літаратуру ці культуру, то не будзе абыякавы да народных мас. Вядома, гэта ж адзінкі, але ці не варта пісаць для адзінак? Гэта ж паэты нясуць народ, бо тое, што можна пераказаць у тамах навуковых матэрыялаў, можна звязаць у пару радках верша, да якога заўжды можам вярнуцца, бо ён нас чаруе спосабам светабачання пры дапамозе не стылістычных сродкаў, толькі слоў. Слова заўсёды мела ў сабе магутную моц, асабліва запісанае на паперы. Кніжку ніколі не заменіць электронны дакумент, бо ж кніга бясцэнная — яе можна дакрануцца, пачуць пах друкарскай фарбы і заўсёды да яе вярнуцца. Гэта душэўная магія мець заўсёды сябра пад рукою, які завядзе нас у чароўную краіну вечнага дабра і шчасця, якое даўно прамінула. Творчасць дае спагаду для паэта — кніга сустракае зразуменнем аднадумца. Сэнс пісаць не колькасна, не прафесійна, але якасна, каб твор быў паэту і чытачу святам у шэры восеньскі дзень. У тым сэнс і паяднанне рэчаіснасці са светабачаннем паэта.

Юрка БУЙНЮК

Святкаванне Ражджаства Хрыстовага

Міхал МІНЦЭВІЧ

Настала вялікае свята Ражджаства Хрыстовага. У гэтыя асаблівыя дні ў душы кожнага хрысціяніна ўзнікае радаснае светлае пачуццё. Адзіны, непадобны на іншыя, вечар у годзе — гэта Куцця, навячэр'е Ражджаства Хрыстовага, калі ў мільёнах дамоў па ўсім свеце думкі хрысціян кіруюцца ў Святую Зямлю і Віфлеем, дзе два тысячагоддзі таму здзейснілася тайна прыходу на свет Збавіцеля — Дзіцяткі Ісуса.

Нараджэнне Ісуса Хрыста здзейснілася ў пячоры каля Віфлеема (каля дзесяці кіламетраў на поўдзень ад Іерусаліма). У непагадзь пячора служыла прытулкам пастырам і іхняй жывёле. Яна стала месцам асаблівага пакланення ўжо з самага пачатку хрысціянства.

Прадвесце прыходу Месіі ў Віфлеем напісаў прарок Міхей: „І ты, Віфлеем Ефрата, хаця ты малы між тысячамі Іудзінымі, з цябе выйдзе Мне Той, які павінен быць Уладаром у Ізраілі, і Якога з'яўленне з пачатку, з дзён вечных" (Міх. 5:2).

Гэтае прароцтва збылося, пра што паведамляе прароцтва ад Лукі: „У той час быў абвешчаны загад кесара Аўгуста, каб правесці перапіс насельніцтва ўсяго свету. (...) І пайшлі ўсе запісвацца, кожны ў свой горад. Падаўся таксама Іосіф з Галілеі, з горада Назарэт, у Іудзею, у горад Давіда Віфлеем, бо выводзіўся ён з дому і роду Давіда, каб запісацца з Марыяй, заручанай яму жонкай, якая была цяжарная. Калі яны там былі, наступіў час родаў. І нарадзіла Сына свайго першынца, і спавіла Яго, і паклала Яго ў яслі, бо не было ім месца ў гасцініцы" (Лука, 2:1-7).

Першыя хрысціяне паставілі над яслямі дом малітвы. У 326 годзе за ахвяраванні імператара Канстанціна Вялікага і ягонай маці Галены пабудавана была вялікая пяцінефавая базіліка, якая, вытрымаўшы бурлівыя стагоддзі пажараў, нападаў, грабяжоў і перабудоў, на сённяшні дзень астаецца месцам служэння праваслаўнай літургіі. Усталяваўся там асаблівы звычай — паломнікі складваюць пальцы так, як робіць гэта блаславяючы святар. У XVI стагоддзі базіліка дастаецца праваслаўным, у 1660 годзе займаюць яе каталікі, але ў 1757 годзе пераймаюць яе зноў праваслаўныя, пакідаючы адно левы флігель армянам.

Штогод сядаем за калядны стол для самай радаснай сямейнай урачыстасці. У той дзень ніхто не павінен аставацца сам. У Орлі ўжо ад дзесяці гадоў ладзіцца Куцця для адзінокіх з тэрыторыі гміны; напярэдадні Ражджаства Хрыстовага ўсе хочуць быць разам са сваімі блізкімі. Гэтая сямейная ўрачыстасць раскрывае ў нас усе лепшыя пачуцці, а калі ўжо засталіся толькі ўспаміны, тады кожны вяртаецца ў думках да маці, бацькі, сясцёр і братоў. Спадарожнічае нам таксама рэфлексія пра наша асабістае, грамадскае і нацыянальнае жыццё.

Традыцыя калядных святкаванняў — гэта гісторыя людзей, якія заўсёды цешацца, што Бог пасяліўся між імі. Чакаюць яны першай зоркі на небе, паколькі зорка (святло) была сімвалам нараджэння Месіі. Сноп буйнага калосся, які яшчэ там-сям заносяць у хату, абазначае, што Бог нарадзіўся ў Віфлееме — горадзе хлеба, а таксама што Бог становіцца не толькі чалавекам, але і хлебам. Бог дараваў нам жыццё, права на развіццё, перадаў нам у карыстанне зямлю і ўсе яе багацці. Абрад гэты — цяпер найчасцей вядомы з расказаў бацькоў і дзядоў — змяшчае ў сабе глыбокі сэнс важнасці хлеба ў нашай культуры. Таму трэба нам навучаць нашых дзяцей пашаны для „хлеба нашага штодзённага".

Настала вялікае свята Ражджаства Хрыстовага. У гэтыя асаблівыя дні ў душы кожнага хрысціяніна ўзнікае радаснае, светлае пачуццё, бо Хрыстос нараджаецца нам усім, прыносячы на зямлю добрую волю нябеснага Айца.

Свята Ражджаства Хрыстовага прыгадвае нам і паклон траіх мудрацоў Хрысту, якія з далёкіх краін прыбылі ў віфлеемскую пячору, прыносячы Хрысту дары. Кім былі яны, прыведзеныя зоркай? Мабыць, былі яны іранскімі вешчунамі, магчымымі паклоннікамі Зараастра (Заратуштры) або халдзейскімі астраномамі. Каля Ісусавых ясляў з'явіліся яны прадстаўнікамі Усходу, прыносячы з сабою ўсе здабыткі дахрысціянскіх культур з іх таемнымі ведамі і таемным чаканнем прыходу Збавіцеля.

Амаль у кожным доме ўпрыгожваюць ёлку, жывое дрэўца, сімвал райскага дрэва жыцця. Гэта знак Нараджанага, які прыйшоў да нас з многімі дарамі. Дрэва — гэта ўся гісторыя збаўлення. З дрэва пачаўся грэх і на дрэве Хрыстос нас збавіў. Упрыгожанне дрэўка свечкамі сімвалізуе Хрыста — святло свету. Бліскучыя шарыкі, каляровыя цацкі, падарункі ад Дзеда Мароза маюць узмоцніць радасць людзей добрай волі, бо Бог нам нарадзіўся і абсыпаў дарамі. Пад ёлку ставяць яслі ў памяць нараджэння Сына Божага ў Віфлееме.

Наша ёлачная традыцыя, аднак, крыху мяняецца, нярэдка прымае камерцыйны характар. Многія людзі не ўпрыгожваюць ёлкі ўнутры дома, але навонкі, напрыклад, на балконе або перад домам. З гарадоў у вёскі прыйшоў звычай упрыгожваць лямпкамі жывыя дрэвы, напрыклад, пладовыя, або нават платы ці сцены хаты. Перадсвяточнае афармленне вуліц завітала і ў малыя мясцовасці, напрыклад, у маёй Орлі сёлета цэлы цэнтр рынку асветлены лямпачкамі на прывулічных дрэвах.

У ліку дванаццаці страў, якія рыхтуюць на Куццю, не можа бракаваць рыб — традыцыйнага хрысціянскага сімвала таямніцы (грэчаскае слова „іхтыс" абазначае рыбу, а яго літары — Ісус Хрыстос, сын Бога). Напамінае яна нам, каб не бракавала зычлівага стаўлення да людскіх тайнаў. Дробныя штодзённыя справы, якія давярае нам другі чалавек, з'яўляюцца для яго вельмі важнымі, і не могуць яны стаць спажывай для плётак і клеймавання. Трэба нам навучаць сваіх дзяцей прыгожага ўмельства стрымліваць таямніцу.

У Польшчы паўсюдна захаваўся звычай класці сена пад абрус на калядны стол. Сена прыгадвае нам убоства віфлеемскай пячоры і Марыі, якая паклала народжанага Хрыста на сена ў яслях.

Падчас каляднай вячэры найбольш красамоўнымі для нас з'яўляюцца аплатка або куцця і сустрэча пры супольным стале. Аплатка і куцця — гэта знак Бога, які ёсць хлебам радасці, прымірэння і добрых пажаданняў. Дзелячыся аплаткай або куццёй, сімвалічна выказваем узаемную чалавечую ахвярнасць, падкрэсліваем, што нават апошнім кавалкам хлеба трэба падзяліцца з бліжнім. Гэта прыбліжае далёкіх і аб'ядноўвае пасвараных. Нахіленыя над хлебам радасці апускаемся ўглыб сябе і праз прызму ўласнага сэрца і розуму выходзім адначасна насустрач іншым. У гэтым хлебе адлюстроўваецца наша сумленне і таму прымушае ён нас да такой засяроджанасці.

Стол — самае адпаведнае месца для сапраўднай сустрэчы. Пры стале сядаем блізка адзін аднаго, тварам у твар, узаемна сабе дапамагаем. Такім чынам падмацоўваемся не толькі стравай, але і прысутнасцю іншых. На Куццю пакідаем пры стале адно свабоднае месца для чаканага госця. Выслоўе „госць у дом — Бог у дом" — вынік нашай гасціннасці і памятка пра словы Госпада Ісуса Хрыста: „сапраўды гавару вам, тое, што вы зрабілі гэта аднаму з братоў Маіх меншых, зрабілі гэта і Мне" (Матф. 25:40).

Шкада, што ў сённяшніх цесных кватэрах часцяком стол заменены нізкім столікам-лавай, якая штодзень стаіць пры сцяне, да якой сядаюць толькі з аднаго боку, як у глядзельнай зале — каб не засланяць тэлевізара — найважнейшага абсталявання і сімвалу падпарадкавання...

Усе любім Ражджаство Хрыстовае за яго асаблівы сямейны настрой, за тое, што наш Бог стаў Дзіцяткам. Дзелячыся аплаткай або куццёй падумайма, як было б цудоўна на свеце, калі б так штодзённа ўсе людзі працягвалі да сябе рукі, калі б дзяліліся хлебам і сэрцам, а не нянавісцю, агрэсіяй, вайной.

Сучасны Віфлеем, Іерусалім з яго сакралізаванымі жыццём і пакутамі Хрыста месцамі, Назарэт, Кана-Галілейская, Капернаўм, Іерыхон, які лічыцца найстарэйшым горадам свету — гэта толькі некаторыя назвы, якіх успамін асацыюецца ў нас з паняццем Святой Зямлі.

Сотнямі гадоў у тым свяшчэнным усім хрысціянам месцы сапернічаюць палітычныя, рэлігійныя і нацыянальныя ўплывы розных суб'ектаў, а цяпер увесь абшар Святой Зямлі ахапіла ізраільска-палесцінская канфрантацыя, у выніку якой церпіць яе сакральнасць, святасць не толькі хрысціян, але таксама іудзеяў і мусульман, пазначаная — асабліва ў Іерусаліме — уласнымі традыцыйнымі культавымі месцамі.

Меншае лік хрысціян у Святой Зямлі: у 1948 годзе было іх каля чатырохсот тысяч, сёння іх (усіх абрадавых плыняў) каля 80-100 тысяч; у самім Іерусаліме каля дзесяці тысяч. Ізраільскі парламент забараніў цэрквам прапаведавання хрысціянства сярод яўрэяў, абмежаваная дзейнасць хрысціянскіх цэркваў.

Варта і нам пра гэта помніць, калі асаблівы настрой Ражджаства Хрыстовага і калядак скіруе нашы думкі ў Святую Зямлю, да ясляў у віфлеемскай пячоры.

З'езд-опера (2)

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У кулуарах з'езда паставіў я Яну Сычэўскаму пару пытанняў. На пытанне, якімі сродкамі Таварыства пагасіла кошты здзейсненых у 2006 годзе мерапрыемстваў, на якія МУСіА адабрала датацыю, старшыня адказаў, што ў Таварыства былі дастатковыя ранейшыя зберажэнні. У зачытанай справаздачы была мова пра нулявое цяпер зацікаўленне выпускнікоў нашых ліцэяў штудыямі ў Беларусі ў выніку пагашэння важнасці дыпломаў беларускіх вузаў і неабходнасцю іх настрыфікацыі ў Польшчы. Спытаў я, якія захады выконвае Таварыства з мэтай усё ж такі зацікаўлення нашых абітурыентаў гэтай магчымасцю, якая не пагасла. Ян Сычэўскі адказаў, што прапановы навучання ў Беларусі пастаянна паступаюць з Міністэрства адукацыі РБ і Таварыства перасылае іх у адпаведныя ліцэі. Далей пацікавіўся я, якія меры праводзіць Таварыства дзеля заахвочвання навучанню дзяцей беларускай мове.

— Уся наша дзейнасць павінна прычыняцца і мяркую, што ў нейкай меры прычыняецца да зацікаўлення настаўнікаў, моладзі, дзяцей беларускай мовай. Усе конкурсы, уся дзейнасць сярод дзяцей і моладзі павінна гэтаму спрыяць. Калі гаварыць пра непасрэдны ўплыў на бацькоў — гэта справа цяжкая. Мы не раз прабавалі, сустракаліся з бацькамі і ў Сямятыцкім павеце, і ў Беластоцкім. Калі няма добрай волі з боку бацькоў, то наша агітацыя нічога не дае. А нават бывалі такія выступленні, даволі экстрэмальныя: чаго вы прыязджаеце сюды, калі мы і так свядома прымаем рашэнні, каб дзеці не вывучалі беларускай мовы. Ну, і што зрабіць? Няма ніякай магчымасці, не загадаеш. Можна толькі заахвочваць; і заахвочваем.

Закрануў я таксама справу ўкараненння крыніц дапамогі Таварыству з Польшчы і Беларусі. Ян Сычэўскі сказаў, што пра дапамогу з Беларусі было ўжо многа сказана, а ў Польшчы турбуюць адмовы з боку МУСіА датаваць многія мерапрыемствы, якія рэалізаваліся дзесяткамі гадоў, а цяпер нішчыцца гэта ўсё. Да такіх належаць прэзентацыя культур нацыянальных меншасцей у Мельніку-на-Бугу, Фестываль беларускай і польскай песні Беласток — Гродна, Міжнародная навуковая канферэнцыя „Шлях да ўзаемнасці"...

— У гэтым годзе адбылася...

— Адбылася, але калі я быў цяпер і запытаўся пра перспектывы, на будучы год ужо ні граша не даюць — ні на канферэнцыю, ні на фестываль. Калі так будзем гуляць, тады да нічога не дойдзем — гэта ж зразумела. Сістэма культуры патрабуе таго, каб мы мелі надзею, мелі поўную пэўнасць што акрэсленыя мерапрыемствы будуць фінансавацца. А так плануем мерапрыемства, а яны ў снежні гавораць, што мерапрыемства са студзеня не дафінансуюць, калі ў нас ужо пайшлі прыгатаванні; так было з „Гвяздай і калядкай". Гэтая палітыка вельмі нецікавая...

Дыскусія (Allegro)

У дыскусіі прынялі ўдзел Віталь Бонда, Павел Лемеш, Васіль Сегень, Анатоль Навіцкі, Ян Зенюк, Кастусь Масальскі, Мікалай Вярбіцкі, Вольга Рыгаровіч, Уладзімір Прыступюк, Іванна Чабан, Ніна Бялецкая, Юры Баена, Аляксандр Лойка, Аляксей Тур, Віктар Бура, Міхал Лісоўскі, Тамара Русачык і Мікалай Сычэўскі. Прывяду толькі найцікавейшыя выказванні.

Віталь Бонда запрапанаваў стварыць адмысловую камісію, якая б ацаніла адносіны ўлад да беларусаў. Бо дыскрымінацыя беларусаў не спынілася; хаця ўладу ў краіне ўзяла Грамадзянская платформа, то нашым ваяводствам надалей кіруе Зялінскі. І нашы справы трэба занесці мо пад абрады сеймікі, а не спатыкацца малымі крокамі. Маем свайго віцэ-прэзідэнта, а дзе ён? Можа выбярэмся да яго пагаварыць і пра сваё расказаць. Ведаем, як медыі ставяцца да ўлад РБ. А ці не наладзіць прэс-канферэнцыі, на якую прыехалі б людзі з Захаду, напрыклад з Манчэстэра, дзе ёсць беларусы, і хай яны агалосілі б нашы праблемы. У нас верхаводзяць тыя арганізацыі, якія не займаюцца культурай, а толькі палітыкай, і то такой, якая скіраваная супраць афіцыйных улад Беларусі.

Павел Лемеш сказаў, што беларусы Беласточчыны аднікуль не маюць падтрымкі: ні ад Беларусі, ні ад нашых уладаў. Гэтыя што адышлі ад нас, а менавіта газета „Ніва", рэдактары, „Рацыя" і другія, яны выводзяцца з беларускага таварыства. Яны ў гэтай зале колькі выступалі, яны з'яўляліся прыхільнікамі беларускага таварыства, яны стваралі ўмовы працы ў нашым БГКТ, а цяпер з'яўляюцца першымі ворагамі, дзе не хочуць нават і са мной некаторыя гэтыя ўлады гэтых усіх Рацыяў і не Рацыяў, і беларускага радыё, Вапа, і другія, і рэдактары „Нівы" — не хочуць нават сустрэцца са мною; я тожа не хачу з імі! Мы не маем, як то гаворыцца, прабіўной сілы. Вось у гэтых радыё ці тэлебачаннях імпрэзы ў руках. Вось сёння бачыце — нікога з гэтых рэдактараў журналістаў няма, каб апісаць у газету „Ніву", па радыё падаць, па тэлебачанні перадаць. Няма гэтых журналістаў, на жаль. І яны з'яўляюцца нашымі першымі ворагамі. А паслухайце гэтыя канцэрты пажаданняў, каторыя перадае радыё Рацыя, і нават нашы гэтыя беларускія, каторыя вёў Праховіч, няма ніводнай песні нашых беластоцкіх калектываў, з нашых вёсак. (...) Толькі выбралі сабе некалькі гэтых такіх калектываў „джу-джу-джу-джу" і яны паўтараюць „вёсачка, сарочка вышываная". (...) Цяпер будзе адбывацца фестываль „Беларуская песня-2010". Сапраўды ніхто не ўчуе гэтай перадачы ні па радыё, ні па тэлебачанні, ні ў прэсе; яны адвучыліся. А ж яны выводзяцца згэтуль, я памятаю гэтага Яўгена Вапу, сядзеў, закасаў рукавы [тут прамоўца паказаў пальцам у мяне — А. В.], крычаў, рукамі махаў, усё жыццё рукамі махае. Ну, што з гэтага? (...) Яны не хацелі быць у беларускім таварыстве, толькі каб выбіцца, каб стварыць свае Саюз беларусаў у Польшчы, Радыё Рацыя, каб быць начальнікам, водзам. А быць простым чалавекам, членам, так як я — не. Яны выбіліся.

Спадар Лемеш даў прыкурыць не толькі „Ніве" і „Рацыі", не цырымоніўся ён і з Беларуссю за розныя грахі перад Беласточчынай. На гэта даў адказ генконсул Беларусі ў Беластоку Міхал Аляксейчык: „Беларусь прыцягнула на Беласточчыну многа сродкаў і я сумняваюся, ці нейкая дзяржава так дапамагае сваёй меншасці. Але ў Гайнаўцы на цэнтры беларускай культуры не напісалі нават, што з Беларусі грошы атрымлівалі; напісана, што ад нейкіх фондаў, але ад Беларусі — не. Я ладзіў канцэрты найлепшых калектываў, напрыклад тэатр Зніч. Толькі дзе — у Гайнаўцы, бо там прабіваюся, і ў Гарадку — пакуль там Юрка Астапчук быў. Колькі разоў я звяртаўся да ўлад Бельска-Падляшскага, каб паказаць што, але нікога гэта не цікавіць; можа вы ў нізах крыху зварушыце. Колькі мы касцюмаў дзецям пашылі. (...) Колькі мы сюды цягнем калектываў з Беларусі, і ніхто ім грошай не плаціць, а гэта ж тожа простыя людзі, самадзейнікі..."

Ян Зенюк, м.інш., прыгадаў, што БГКТ унесла агромны ўклад у пабудову Беларускага музея ў Гайнаўцы і, нягледзячы на тое, што рашэннем суда Музей адышоў пад іншае падпарадкаванне, Таварыству трэба надалей падтрымліваць кантакты з ім і памагаць забяспечваць сабраныя помнікі нашай спадчыны, каб там выхадайнічаць залу, прысвечаную ўкладу БГКТ у паўстанне музея. Каб уключацца ў правядзенне мерапрыемстваў, ладжаных музеем. Нам трэба шукаць узаемных кантактаў з усімі. І тым, што супрацьстаяць уладам БГКТ, таксама ляжыць на сэрцы справа беларускасці. І думаю, што новае Галоўнае праўленне павінна глянуць на гэтую праблему і пашукаць нейкага пераломy ў гэтым напрамку, так як гэта робяць немцы, літоўцы ці ўкраінцы — гляньце як яны гуртуюцца!

Вольга Рыгаровіч дзякавала кіраўніцтву БГКТ і прадстаўнікам беларускіх улад. Каб не іх дзейнасць беларуская культура ў нас можа яшчэ не памерла б, але напэўна была б у агоніі. Калектывы паўстаюць пад вас, — гаварыла яна, — каб вам паказаць на беларускім фэсце тое, што яны ўмеюць — яны існуюць дзякуючы вашай дзейнасці. У нас мерапрыемствы найцікавейшыя, калі ладзяць іх Валя з Янкам, і людзі ад гэтага ганарацца, што яны з'яўляюцца беларусамі. Калі б я магла, то ўзнагародзіла б вас нейкім медалём.

Многія прадмоўцы гаварылі, што ў мінаючай кадэнцыі БГКТ ішло цярновым шляхам, — сказаў Юры Баена. — Але я ўсё-такі аптыміст і думаю, што пік гэтага крызісу за намі і думкі кірую ў наступную кадэнцыю. У мяне спарадзілася адна такая думка, што ў найбліжэйшай кадэнцыі добра было б, каб у важных для нас, беларусаў Беласточчыны справах, органы БГКТ свой погляд, свае канкрэтныя пазіцыі выпрацоўвалі ў пісьмовай форме. І з гэтымі пазіцыямі трэба звяртацца да медыяў, перш за ўсё да прэсы — у „Ніву" кіраваць, у „Часопіс", „Przegląd Prawosławny". Мая думка ідзе ў тым напрамку, каб старшыня не адчуваў сябе адзінокім у змаганні, каб не адчуваў, што ён у акружэнні зграі непрыхільнікаў і ворагаў беларушчыны. З нашага боку патрэбная будзе падтрымка, дапамога.

Міхал Лісоўскі звярнуў увагу, што ў справаздачы з'езду адчуваецца жаль і злосць да кагось і да чагось. — На маю думку злосць ніколі не вядзе да інтэграцыі, але дзеліць. Добра было б сарганізаваць супольную канферэнцыю і нанова перадумаць пэўныя справы, што дзеляць. Бо кожную іншасць трэба ўшанаваць, кожны ж нешта думае. Ёсць на Беласточчыне многа арганізацый і можа не крытыкуйма, што яны існуюць. Калі яны ўзніклі, значыць — камусь яны патрэбны, хтось інакш думае, думае пра прагрэс, каб наш рэгіён быў багацейшы і лепшы. І канферэнцыя была б пад лозунгам „Іншасць як чыннік інтэграцыі і прагрэсу рэгіёна". Нам жа ж залежыць на тым, каб жыць добра і спакойна, бо ніхто іншы нам дабра не прынясе. Мы можам гаварыць, што немцы нас білі, але ўжо можа ёсць такія немцы, якія нас не б'юць.

Завяршэнне (Furioso)

З'езд БГКТ выбраў новыя ўлады арганізацыі. Старшынёй быў абраны Ян Сычэўскі, яго намеснікамі Васіль Сегень і Юры Баена, сакратаром — Валянціна Ласкевіч. У склад прэзідыума ГП БГКТ увайшлі яшчэ Віталь Бонда, Гражына Валкавыцкая, Валянцін Галушэўскі, Іаланта Гецьман, Іаланта Грыгарук, Анатоль Навіцкі, Тамара Русачык, Ян Сухадола і Сяргей Шчыгал. Старшынёй Галоўнай рэвізійнай камісіі выбраны Мікалай Вярбіцкі, яго намеснікам Мікалай Гаўрылюк, сакратаром Канстанцін Масальскі і членамі Надзея Нявінская і Сцяпан Зенюк. Канчаючы з'езд пераабраны старшыня ГП БГКТ сказаў:

Перыяд перад намі будзе не менш цяжкі, чым перыяд, які мы сёння падсумавалі. Таму што атмасфера для нацыянальных і этнічных меншасцяў у нашай дзяржаве неспрыяльная; кажу гэта з болем і жалем, але яно так ёсць. І справа не ў тым, як гаварыў адзін з выступоўцаў, што мы трымаем пазіцыю як бы распаўсюджвання нейкай нянавісці. Нянавісці няма, але трэба мець свядомасць, бо калі няма свядомасці, што цябе крыўдзяць, то будуць крыўдзіць яшчэ больш і будуць смяяцца, будуць смяяцца з наіўнасці, несвядомасці і г.д. Нам сваю пазіцыю трэба паказваць, адстойваць і ваяваць за тыя нашы справы, якія вельмі важныя для падтрымкі нашай культуры, нашай нацыянальнай тоеснасці, нашай асветы — нашага грамадскага развіцця як сучасных свядомых, адукаваных людзей, без гэтага нельга. І я перакананы яшчэ аб тым, што калі мы пойдзем на супрацоўніцтва з некаторымі асяроддзямі, якія про-

працяг ☞10

9 ☞працяг

З'езд-опера

ста нас не любяць, якія ўвесь час — і калі ёсць прычына, але перад усім найгорш, калі няма ніякай прычыны — увесь час нас — прабачце — абсабачваюць. Нічога добрага не пачуеце ў некаторых сродках масавай інфармацыі, нічога добрага не пачуеце тады, калі мы праводзім мерапрыемства і яно паспяховае з пункту гледжання і публікі, і выканаўцаў, і той зусім чужой аўдыторыі — маю на думцы палякаў-католікаў — яны сумеюць захапляцца. Але нашы малайцы ўвесь час маюць такую задачу каб нас кусаць безупынна, без прычыны. І прабачце, што я крышку прадоўжу сваё выступленне. Калі я ў „Ніве" пасля такіх фактаў, як рашэнне Зялінскага, які даў нам нож у плечы на 400 тысяч злотых — гэта супраць права, супраць закону — і „Ніва" з'яўляецца адзінай газетай у Польшчы, якая з гэтай прычыны цешыцца. Або: „Ніва" з'яўляецца адзінай газетай у Польшчы тады, калі камісар ваяводства Схабенскі — таксама з Сувалкаў — забірае нам прызнаныя ваяводскім праўленнем, Маршалкоўскай управай грошы на нашы мерапрыемствы, у тым ліку на Свята беларускай культуры — поўнасцю забірае, да граша — і таксама „Ніва" цешыцца ў сваім інтэрв'ю з гэтым „героем", так сказаць, польскага шавінізму я б сказаў, бо гэта цяжка назваць дэмакратыяй. І ў тым самім часе вялікія грошы Маршалкоўская ўправа прызнае, напрыклад, Ваяводскаму асяродку анімацыі культуры па некалькі сот тысяч, ну, гэта справа ненармальная. І я перакананы, што пакуль паміж намі не будзе талерантнасці, супрацоўніцтва проста немагчымае. Таму, калі мы будзем працягаць руку і добрую волю выказваць, гэтая добрая воля сустрэнецца заўсёды з тым, аб чым я гавару, з нянавісцю нейкай. Па якой прычыне хацелі знішчыць фестываль, я пытаўся: па якой прычыне, у чым справа? Фестываль гэта што: месца адстойвання нейкіх палітычных інтарэсаў, спраў? Гэта ж было проста хуліганства, кожны свядомы чалавек гэта ведае. Таму думаю, што мы ўсё ж такі павінны мець свой гонар беларусаў, гэтага гонару бараніць увесь час і мець свядомасць, што не заўсёды, калі хтось крытыкуе, ён мае рацыю. Бо вельмі часта крытыкуюць зусім беспадстаўна з такой мэтай каб нішчыць, не папраўляць дзейнасць, але нішчыць гэтую дзейнасць. Таму здаецца, што наша функцыя, наша місія на чарговыя гады цяжкая будзе надалей, але мы ў сіле такую місію выканаць, калі сапраўды будзем мець пачуццё еднасці, пачуццё адказнасці за нашу нацыю на Беласточчыне і ў Польшчы, і калі сумеем так прыгожа, так цудоўна, так выдатна і плённа супрацоўнічаць з нашай этнічнай радзімай — Рэспублікай Беларусь. Доказам гэтаму з'яўляецца прысутнасць выдатных прадстаўнікоў Беларусі сёння; польскія ўлады не бачаць беларускай нацыянальнасці, не бачаць культуры беларускай. Так што дзякуем вам, шаноўныя, дарагія і дастойныя госці, дзякуем усім дэлегатам, дзякуем усім прысутным. Я хачу пры гэтай нагодзе яшчэ звярнуць увагу на аднаго чалавека, які сёння не згадзіўся кандыдаваць у Галоўную рэвізійную камісію — маю на думцы Міхася Хмялеўскага, чалавека — жывую гісторыю беларускасці і БГКТ, таму што ад пачатку дзейнасці гэтай арганізацыі ён увесь час быў звязаны і з беларускасцю, і з беларускай газетай „Ніва", і з культурай беларускай, і з БГКТ. І думаю, што можна падкрэсліць пры гэтай нагодзе — тады „Ніва" была іншай газетай, тады „Ніва" служыла беларусам. Я не таму гавару, што яна служыла Беларускаму таварыству, бо была органам Беларускага таварыства, але многія нармальныя людзі гавораць, што тады сапраўды „Ніва" пісала пра важныя праблемы беларусаў, беларускасці, культуры, асветы, школьніцтва ў тадышнім Беластоцкім ваяводстве. Можна гаварыць і пра другія медыі — не ў тым справа, каб расцярушваць сваю ўвагу на многія праблемы.

Пасляслоўе

У справаздачы з'езду „нянавіснікам" Таварыства прысвечана было каля пятнаццатай часткі яго зместу, затое ў фінальным экспазе старшыня Сычэўскі прысвяціў ім амаль увесь змест. Такі, вось, галоўны пункт стратэгічнага плана на будучыню. Ні слова не было прысвечана нейкаму хаця аналізу той „нянавісці". Чаму тыя людзі, што „махалі рукамі" ў Таварыстве, зараз навонкі яго. Не было ж на з'ездзе многіх відных беларускіх людзей, пачынальнікаў многіх ініцыятыў; мабыць сталі „водзамі"... Сам старшыня Сычэўскі прагаварыўся, што ў зале ёсць прадстаўнікі мастацкіх калектываў, якія ўжо адной нагой па-за апекай Таварыства. Міхась Хмялеўскі патайком прызнаўся мне, чаму ён адмовіўся; не буду рассакрэчваць даверанай мне тайны, каб і яму не прыклеілі нейкай адмоўнай мянушкі. Іншыя пакідаючыя з'езд дэлегаты таксама паўголасам усакрэчвалі мяне, што ніякай змены не прыйдзецца спадзявацца. Бо ж і так ад гадоў відаць, што думкі Яна Сычэўскага ў такім саркафагу, які і не думае даваць трэшчын.

Яшчэ слоў пару пра гайнаўскі Беларускі музей, які справядліва лічыцца нашым, беларусаў Беласточчыны, скарбам. Бо ж будавалі яго ўсе — і юрыдычныя асобы, і прыватныя, і ананімныя. І цяпер усе яны, гэтыя ціхмяныя беларусы, могуць на ўвесь голас заяўляць: „Мы будавалі!" І рваць той музей кожны ў свой бок — ужо ж быў разбор перад судом. На з'ездзе таксама не адбылося без прапаноў, на гэты раз спакойных — які змест напісаць на памятную дошку, што мае быць прыбіта да сцяны Музея. Юры Зюзя прыслаў з Варшавы ліст з наступнай прапановай: „Музей быў пабудаваны з фінансавых сродкаў беларусаў з Польшчы, беларусаў з цэлага свету, Польскай Народнай Рэспублікі і яе грамадзян, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і яе грамадзян, Рэспублікі Польшча і яе грамадзян, Рэспублікі Беларусь і яе грамадзян". Чаго ж нашы геніяльныя людзі не выдумаюць!..

Чаму опера ў загалоўку? Бо персанажы оперы ярка афарбаваныя — адны чорным колерам, іншыя — арэолаваным светлым. Акурат так, як адмаляваная на з'ездзе мясцовая рэчаіснасць.

Надыходзячае Раство Хрыстова робіць больш добрымі і чулымі нашы сэрцы. Наваколле таксама становіцца больш прыгожым і святочным. Асабліва гэта адчуваецца ў хрысціянскіх храмах.

Цягам доўгіх дзесяцігоддзяў, што мінулі пад камуністычнай уладай, у Беларусі свята Божага Нараджэння большасць людзей калі і адзначалі, то толькі дома. Цэрквы былі зачынены ці ўвогуле зруйнаваны.

На шчасце, час змяніўся. Сёння ў Беларусі колькасць храмаў як праваслаўных, так і каталіцкіх павялічваецца — некаторыя з іх рамантуюцца і аднаўляюцца, іншыя будуюцца наноў. Сярод цяперашніх цэркваў і касцёлаў шмат і тых, якія лічацца помнікамі архітэктуры. Віртуальна пазнаёміцца з імі дапаможа сайт „Помнікі архітэктуры Беларусі. Каталіцкія і праваслаўныя храмы".

Згаданы сайт месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://pomnik.h12.ru. Пабудаваны ён даволі неардынарна — там няма падзелу на часткі, выйсці да рубрык змешчаны толькі зверху выяўлення.

Пра сайт вельмі падрабязна распавядаецца на галоўнай старонцы. „У базу дадзеных унесены храмы ад найстаражытнейшага на беларускай зямлі Сафійскага сабору ў Полацку да сучасных касцёлаў і цэркваў, пабудаваных пасля заканчэння атэістычнай савецкай эпохі", — сцвярджаюць аўтары „храмавага" сайта. Варта адзначыць, што яны — не інкогніта, і ў звестках пра сайт распавядаюць, што ён з'яўляецца вынікам дыпломных прац двух студэнтаў гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Больш падрабязна аб гэтых працах можна даведацца на старонцы „Аб праекце". Праўда, звычайнаму інтэрнэт-карыстальніку можа будзе крыху нуднавата чытаць доўгі тэкст пра крыніцы і метады даследавання, якія выкарыстоўвалі студэнты падчас выканання свайго дыпломнага праекта. Разам з тым, верагодна будзе цікава пазнаёміцца з высновай аўтараў аб тым, што большасць каталіцкіх храмаў у Беларусі знаходзіцца ў Брэсцкай вобласці, а Беларусь падзяляецца на каталіцкую і праваслаўную з паўднёвага захаду на паўночны ўсход.

Таксама, па сцвярджэнні даследчыкаў, дзве асноўныя канфесіі суіснавалі на тэрыторыі Беларусі і ўзаемна ўзбагачаліся. „Тым не менш, асноўны ўплыў рабіла каталіцкая культура на праваслаўную. Шмат праваслаўных цэркваў было пабудавана ў тыпова каталіцкім стылі барока ці ракако, але не было ніводнага касцёла ў рускім стылі", — высветлілі аўтары праекта.

Як кажа прымаўка, лепей адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. Пэўна таму, на старонцы „Каталог" змешчаны спісы каталіцкіх і праваслаўных храмаў з невялікім расповедам пра кожны і здымкам царквы ці касцёла. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што пералік храмаў Беларусі калі не стопрацэнтна поўны, то ахоплівае пераважную іх большасць.

Адным з карысных сервісаў сайта з'яўляецца пошук. Ён дазваляе знайсці той ці іншы храм, не звяртаючыся да спісу. Дастаткова ўпісаць у акенца назву храма альбо назву горада ці вёскі, дзе ён знаходзіцца.

Зразумела, што далёка не кожны інтэрнэт-вандроўнік дакладна разумее разнастайныя архітэктурныя тэрміны і паняцці. Паколькі ў апісанні будынкаў культу без гэтага ніяк не абысціся, а сайт збольшага арыентаваны на неспецыялістаў, то аўтары праекта парупіліся пра адпаведны слоўнік. Зазірнуўшы на аднайменную старонку, кожны неархітэктар зразумее, што значыць „алькеж" ці „табернакль".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Дынамаўскі Кубак Шпенглера

Мінскае „Дынама" заваявала першае месца на традыцыйным Кубку Шпенглера — старэйшым хакейным турніры кантынента, які праходзіць у швейцарскім горадзе Давос ажно з 1923 года. Беларуская каманда ўпершыню была запрошана на розыгрыш гэтага кубка.

На пачатку дваццатых гадоў мінулага стагоддзя вядомы доктар Карл Шпенглер, прапаноўваючы калядныя спаборніцтвы, ставіў дзве мэты: здабыць сродкі для змагання з сухотамі, якія лютавалі ў Еўропе падчас першай сусветнай вайны і пасля яе, а таксама наладзіць сталы спартовы мірны дыялог паміж рознымі краінамі. Што ж, ідэя рэалізавалася з поспехам, а кансерватыўныя швейцарцы працягваюць справу высакароднага лекара. З таго часу традыцыйны калядны турнір не праходзіў толькі чатыры разы: у 1939 і 1940 гадах з-за другой сусветнай вайны, а ў 1949 і 1956 гадах па іншых прычынах. Мясцовы „Давос", дарэчы, часцей іншых — ажно 14 разоў перамагаў на турніры. 12 перамог на рахунку зборнай Канады, якая зноў была прадстаўлена сёлета. Акрамя названых удзел узялі таксама нямецкі „Мангейм" і чэшская „Энергія" з горада Карлавы Вары. Пяцёрка згуляла паміж сабой за пяць дзён у адзін круг пасля чаго дзве мацнейшыя каманды 31 снежня ў фінале выявілі пераможцу. Цікава, што букмекеры галоўнымі фаварытамі лічылі зборную Канады і мінскае „Дынама". Напэўна, яны і выйшлі б у фінал, але эксперыментальная дружына Канады, якая была складзена з тых хакеістаў, што выступаюць у Еўропе і ішла лідарам, нечакана саступіла ў матчы з немцамі. І так сталася, што матч Канада — „Дынама" стаўся своеасаблівым паўфіналам.

„Дынама" стартавала з паразы ад „Давоса" — 2:3. А пасля толькі перамагала — 2:1 над „Мангеймам", ажно 8:0 над „Энергіяй", нарэшце 4:3 над Канадай. У фінале падначаленыя Аляксандра Андрыеўскага адолелі гаспадароў пляцоўкі — мясцовы „Давос" — 3:1, узяўшы тым самым рэванш за паразу ў самай першай сустрэчы. Шайбы ў зброю у вырашальным паядынку закінулі Аляксандр Кулакоў, Дзяніс Качаткоў і Дзмітры Мялешка. Па выніках турніру дырэктарат назваў сімвалічную зборную, у якую ўвайшлі ажно трое прадстаўнікоў бела-блакітных. Поўны склад „ол-старз" турніру наступны: брамнік — Андрэй Мезін („Дынама"), абаронцы Дзьюі Уэсткат („Дынама") — Хайнс (Канада), форварды Спайло („Мангейм") — Сяргей Варламаў („Дынама") — Колнік („Давос").

На жаль, падчас святкавання сам кубак быў па неасцярожнасці пабіты гульцамі „Дынама" ў раздзявальні. Так што дамоў хакеісты прыляцелі з вікторыяй, але без трафея. Крыху пазней арганізатары турніру вырабяць яго дублікат, які будзе перададзены новаспечаным лаўрэатам на захаванне.

Перамога ў Кубку Шпенглера — папулярным, але можна сказаць таварыскім турніры — патрэбная дынамаўцам надзвычай. Справы ў Кантынентальнай хакейнай лізе ў зброю ідуць цераз пень калоду. Ніяк не ўдаецца дацягнуцца да восьмага месца Усходняй канферэнцыі, якое дае права выступаць у плэй-оф. А тут яшчэ паддаў жару новы-стары трэнер нацыянальнай дружыны Беларусі і па сумяшчальніцтве сталічнага „Юнацтва" Міхаіл Захараў, які заявіў, што менавіта яго клуб, як чэмпіён Беларусі, варты прадстаўляць Беларусь у КХЛ. На такія словы ён меў пэўныя падставы — менавіта „Юнацтва" ў 2007 годзе дасягнула беспрэцэдэнтнага поспеху — заваявала еўрапейскі Кантынентальны кубак. Але цяпер і „Дынама" не з гліны злепленае. Час жа пакажа ці пэўны антаганізм па лініях „Юнацтва" — „Дынама", Захараў — Андрыеўскі пойдзе на карысць айчыннаму хакею.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Успаміны з беларускім каларытам

У 1957 годзе быў я прыняты Георгіем Валкавыцкім на журналісцкую працу ў рэдакцыі „Нівы". Тут я пазнаёміўся са штатным журналістам нашага часопіса Юзафам Рыбінскім. Быў ён старэйшым за мяне, нарадзіўся 20 кастрычніка 1912 года ў вёсцы Сачкоўцы каля Кузніцы-Беластоцкай. Беларускую мову ведаў ён у дыялекце роднай вёскі. Тады на Сакольшчыне вясковыя дыялекты былі набліжаны да беларускай літаратурнай мовы. Пазней стаў ён журналістам-рэпарцёрам новаствораннага часопіса „Panorama Północy" і спыніліся нашы непасрэдныя сувязі.

Працуючы потым у варшаўскім выдавецтве „Książka i Wiedza" даведаўся я, што Юзаф Рыбінскі за свае ўспаміны атрымаў першую літаратурную ўзнагароду ў конкурсе аб'яўленым маім выдавецтвам. Першы том успамінаў Юзафа Рыбінскага „Słońce na miedzy" выйшаў у выдавецтве „Pojezierze" ў 1979 годзе і іх аўтар атрымаў узнагароду беластоцкага ваяводы. У 1983 годзе першы папоўнены том быў выдадзены разам з другім томам успамінаў у гэтым самым выдавецтве.

У апошні час я ізноў вярнуўся да гэтых надта цікавых успамінаў Юзафа Рыбінскага. Асабліва ўсхваляваў мяне том першы, прысвечаны побыту аўтара ў сваёй роднай вёсцы Сачкоўцы да 1933 года, калі ён быў прызваны ў польскае войска, у 5 авіяцыйны полк, што размяшчаўся ў Лідзе.

Гэты першы том так насычаны беларускімі словамі, што можна было б з іх стварыць прыкметны слоўнік. Ды не толькі асобныя словы, у тэкстах выступаюць сказы, а нават цэлыя фрагменты беларускага тэксту!

Вось вясковыя хлапчукі-пастушкі закраліся ў садок. Дзедка Міхал Рыбінскі не толькі іх не пакараў, але даў ім груш, сцвярджаючы: *Грушка-мінушка, дасць Бог, на другі год зноў будзе* (с. 10).

Звяртаецца да Рыбінскіх іх суседка: *Слухайце, Рыбінскія, як вы ўжо ў сябе расаду пасадзіце, то можа тады і мне трошкі аставіце* (с. 31).

Аўтар успамінае народны абрад у Вербніцу — нядзелю перад Вялікаднем, калі хлопцы сцябалі дзяўчат па лытках: *Вялікдзень за тыдзень, не я б'ю, вярба б'е* (с. 48).

У жніво на суседнім палетку заспявалі дзяўчаты:

А нашто ж мяне матуленька
замуж аддала,
Калі я яшчэ гаспадаркі
не распазнала.
У гаспадарцы трэба рабіць,
Няма часу прыгожа хадзіць,
Матуля мая (с. 129).

Хлопцы з бліжэйшага палетка адгукнуліся:

Маладыя маладзіцы
Не хадзеце па вуліцы,
Бо настала такое права,
Хто выйдзе — нешта прапала (с. 130).

Вечарэла. Заспявалі дзяўчаты:

Скрылась сонца за ваконца,
Скрылась сонца за лясок (с. 130).

Прадоўжылі хлопцы вядомую ім песню:

Выйдзі, міла, чорнабрыва,
Выйдзі, міла, на часок (с. 130).

Багацейшыя гаспадары запрашалі жнеек на пачастунак. Бедная ўдава дзякавала гаспадару: *А каб даў Бог вам здаровечка! А каб вы заўсёды жылі так шчаслівыя і дзеткі вашыя і каб вы заўсёды маглі другім памагаць. А то я ўжо зусім упала з сілы. А я заўсёды буду вас успамінаць і буду маліцца за ваша шчасце і ваша здаровечка* (с. 138).

А калі памёр гаспадар, пахавальнае шэсце затрымлівалася пры крыжах у канцы вёскі, дзе дачка памерлага праз слёзы перадала сваю просьбу: *Можа яны каму што-колечы злога калі зрабілі, тады прабачце, людкове мільія... У жыцці рознае бывае... Тады ўжо не гневайцеся, выбачайце і даруйце* (с. 148).

На заканчэнне варта прыгадаць словы беларускай народнай песні, якую спяваў аўтар у юным узросце:

Ішла хмара палавая, а за ёю
сіня,
Нарадзіла мая бедна маці
маладога сына.
Нарадзіла яна ёга сярод
цёмнай ночы,
Дала яму краснае ліца
і чорныя вочы.
Трэба было, мая маці, чорных
воч не даці,
Трэба было, мая маці, шчасце
і долю даці (с. 249).

Другі том успамінаў Юзафа Рыбінскага пазбаўлены беларускага каларыту. Том прысвечаны побыту аўтара ў войску польскім і жудаснаму ваеннаму перыяду — яго ўцёкам з нямецкага палону і складанаму вяртанню дадому.

Аб сваім пасляваенным перыядзе жыцця, аб сваёй працы ў многіх установах Беластока аўтар напісаў у трэцім і чацвёртым тамах сваіх успамінаў, якія загінулі і ўжо ніколі не надрукуюцца. А шкада...

Юзаф Рыбінскі памёр у Беластоку ад інфаркту 25 мая 1986 года і пахаваны побач сваіх бацькоў на могілках у Кузніцы-Беластоцкай.

Віктар ШВЕД

Запрашэнне

Бельскі дом культуры
ў Бельску-Падляшскім
запрашае 10 студзеня 2010 г.
(нядзеля), гадз. 17.00 на

XX Юбілейны вечар калядак

У Вечары прымуць удзел хары каталіцкіх і праваслаўных прыходаў, Касцёла хрысціян-баптыстаў, Касцёла пяцідзесятнікаў, а таксама калектывы Бельскага дома культуры. Госцем будзе квартэт Падляшскай філармоніі і оперы ў Беластоку.

Аўтобусная рэклама

Раней аўтобусы гарадской камунікацыі малявалі ў чырвоны колер. Яны былі здалёк відочныя сярод іншых аўтамашын. Вадзіцелі розых аўтамабіляў і грузавікоў звярталі большую ўвагу на „чырванякаў", прапускалі першымі так, як зараз угледзеўшы спяшаючыеся да пажару чырвоныя самаходы пажарнікаў.

Цяпер чырвоныя пасажырскія аўтобусы замянілі разнаколерныя. Да таго яшчэ памаляваныя ўсялякімі рэкламамі, усё з надпісамі. Ці павінны яны трапіць на аўтобусы гарадскога транспарту? Малююць усячыну на цэлыя бакі аўтобуса, на шыбах (!) таксама. Людзі, апамятаймася!

У горадзе вялікі рух аўтамашын і ўсе шафёры ды пешаходы павінны першнаперш звяртаць увагу на дарожныя знакі і святлафоры. Рэкламных запрашэнняў ды заклікаў поўна ў радыё- і тэлеперадачах. Седзячы дома ў фатэлі не трапіце пад машыну. Жыццё вельмі дарагое, не пакідайце яго на дарозе!

Зімой слізкія маставыя дарогі. Прыгадаю такі факт. Было гэта зімою пасля снегападу. У Новым Ляўкове на скрыжаванні дарог аўтобус ПКС з'ехаў у глыбокі роў. На ім быў размаляваны вялікі надпіс „Komfort". Дзякуй за такі камфорт! Вось у Гайнаўцы на аўтобусах гарадской камунікацыі не даюць рэкламы. І добра. Яны здалёк бачныя для пасажыраў і карыстальнікаў дарог.

(яц)

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

14 студзеня 2010
доктар Ірына Багдановіч
„Беларуская літаратура XIX ст. — спроба ідэнтыфікацыі, мастацкі пераклад"
17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Адгаданка

	1	2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15	16	17
			18	19	20	21	22	23

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — італьянскую пагаворку.

1. былая партугальская калонія на захадзе Індыі = 17 _ 7 _ 16 _;
2. жонка Адама = 23 _ 13 _ 10 _;
3. паляўнічы-прафесіянал = 3 _ 4 _ 5 _ 6 _;
4. рака ў Пэру, правы прыток Амазонкі = 1 _ 21 _ 22 _ 20 _ 11 _ 12 _;
5. вучэбная гадзіна = 18 _ 15 _ 14 _ 9 _;
6. хвойнае вечназялёнае дрэва (*Taxus baccata*) = 19 _ 8 _ 2 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 49 нумара

Валынь, вярба, нуда, Уж, цырк, капыл, ешыбот, два, юрта, абцас, палац.

Рашэнне: **Ружы вянуць, але шыпы астаюцца.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (7)

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Міры ЛУКШЫ

Сястра Анатоля Валянціна з партрэтамі бацькоў: Марыі і Ціхана Сысаў

Дзеля папаўнення кнігі цудаў нашага дзядоўскага турнэ мусова забегчы паўтары месяца наперад і трапіць на літаратурны семінар „Бязмежжа-2009", якія традыцыйна ўжо праходзіў у пансіянаце „Бора-Бора" ў нетрах Белавежскай пушчы. Калі над галовамі беларускіх пісьменнікаў пачалі кружыць два матылі, у адным з іх Міра Лукша распазнала дух Анатоля Сыса. Здаецца, ніхто з літаратараў не сумняваўся ў яе адкрыцці. Паўлінавае вока, бо ў такім выглядзе з'явіўся паэт, ад пачатку патрабавала выключнай увагі. Яно пёрлася ў ляпмы жырандоляў, каб пакутна згараць на вачах паэтаў. Аж надакучала... Добра, што на ратунак прыгажуну рушылі дзелавітыя прадстаўніцы беларускай інтэрнэт-бібліятэкі. Усе два дні яны размантоўвалі лямпы і ласкава папракалі назойлівую з'яву:

— *А каб ты быў здаровы!*

Такога цуду якраз і не хапала ў нашай дзядоўскай хроніцы здарэнняў. Факт, матыль павінен з'явіцца сем тыдняў раней на Гомельшчыне, у роднай хаце паэта ў Гарошкаве, у час дзядоўскага застолля з сямейкай і сваякамі паэта. Але, як кажуць: лепш пазней, чым ніколі. Як свята верыць беларускі народ, дух памерлых з'яўлецца на дзядоўскую вячэру якраз у выглядзе матыля. Яго трэба пачаставаць салодкай гарэлкай, заспяваць песню, распавесці пра гераічныя ўчынкі нябожчыка...

Мы з Мірай, як было ўжо сказана напачатку, не маглі наракаць на недахоп сустрэч з пасланцамі іншага свету, наадварот, у наш бок цягнула ўсякай пароды і масці псярня. Тых сабак мы клікалі імёнамі памерлых сяброў і аўтарытэтаў, частавалі іх цукеркамі, лашчылі пяшчотным слоўцам. Каб пабачыў нас які матэрыяліст, няйначай, падумаў бы: *шыбанутыя* цёткі!

* * *

На панадворку Анатоля Сыса, хочаш ці не, станеш такім *шыбанутым*. Калі мы з Валянцінай, сястрой паэта, чакалі прыезду маршруткі, на якой дабярэмся на могілкі, мяне апанталі думкі пра агонь і пажары. Прывід стыхіі наклікала абгарэлая хатка па другім баку вуліцы. Хоць — не! Сігнал даходзіў з-за пашкоджанага плота, ад лысых ўзгоркаў, якія самі сабой напаміналі спелыя грудзі славянкі. Свядомасць, што спазіраем на старажытнае гарадзішча мілаградска-зарубінецкай культуры, дзе ад калыскі натхняўся будучы паэт, апякала як агонь. І Валянціна, быццам у адказ думкам, пачала ўспамінаць пажар пяцідзесяцігадовай даўнасці. Запамятала яго з той самай адлегласці як сёння, седзячы на лавачцы перад іх новай хатай, у свае дзіцячыя гады.

— А я ўсё думала што тады загарэўся ваш дом?

— У нас ніколі не было пажару, — сястра паэта аж жахнулася ад маёй заўвагі. І абачліва дадала: — Дай Бог, каб ніколі яго тут не было!

Апошнія словы зноў павярнулі мяне на наш магічна-падляшскі панадворак. У нас таксама слова пажар вымаўляюць са страхам, ды перажагнаюцца яшчэ на ўсякі выпадак набожна. Каб не наклікаць якой бяды.

Падобнае ўражанне пакінуў твор Анатоля Сыса „Неапаленай Купіне". Спачатку ён успрыняўся як народная замова ад агню і пажару. Пасля высветлілася, што напісала яго жыццёбыццё ў Гарошкаве. Стыхія мела ўспыхнуць у дзень нараджэння паэта. Ён, народжаны ў агні, хацеў ці не, ад калыскі быў пазначаны. Анатолеў лёс аднапляменцы спалучалі з нейкай нябеснай місіяй. Найахвотней бачылі яго ў аблоках, лётчыкам. Як дзядзьку Антона, роднага брата бацькі, па якім будучы паэт атрымаў імя!

— То чаму ахрысцілі яго Анатолем, а не Антонам? — спыталі мы Валянціну.

— Бо гэтыя імёны падобныя на сябе, — без упэўненасці паясніла нам сястра паэта...

У апошняй звестцы я знюхала метафізічны выкрутас. Дзядзька Антон загінуў у катастрофе самалёта на вайне, значыць, у агні. Але замест пытаць пра магічныя хітрыкі з імёнамі я падумала пра Янку Купалу, які таксама натхняўся на старажытных пластах ля рытуальнага каменя ў Акопах.

* * *

Пажар успых на змярканні напрыканцы кастрычніка 1959 года. Дзве хаты далей у бок Заспы, ад той пазначанай пажарам хаты, што насупраць. Марыя і Ціхан Сысы перайшлі жыць у новую мураванку, якую збудавалі на новым месцы. Раней іх загуменне выходзіла ў падножжа старажытнага гарадзішча. У сям'і былі дзеткі: Тамара, Валянціна і Віктар. Бацька вярнуўся з работы і адпачываў на *дзіване*.

— Мы, дзеці, сядзелі на лавачцы, — успамінае Валянціна, тады сямігадовая дзяўчынка, — а мама пайшла да суседкі. Ёй трэба было нешта спытаць. Зайшла, а яны вячэраюць. І цёмна. Лямпа гарыць, дый патухае. А тая суседка гаворыць: пайду, нафту залью. Прынесла ў хату каністру і кліча старэйшага хлопца: *Ідзі, Валодзя, падзяржы!*

Сям'я ў іх была вялікая, чалавек, *наверна*, восем. І такое немаўлятка яшчэ ў калысачцы ляжала. То наша мама кажа: *Нашто Валодзю рукі смуродзіць. Давай, я патрымаю лямпу*. Яна ўзяла тую лямпу і *дзяржыць*. А суседка заліває... І як бухне! Тая каністра разарвалася. Бо ўсярэдзіне бензін быў. Ды ўсе, як стаялі, загарэліся. Тая суседка яшчэ выносіла ўсё з хаты. А мама зразу ўхапіла немаўля, закрыла твар і выбегла на вуліцу. Мы тут сядзім і ўсё бачым... Што гэта дзеецца? Гарашчыя людзі бегаюць! Я пабегла па бацьку. Татка сарваўся з ложка, выбег на вуліцу і накрыў маму фуфайкай. Так уратаваў яе. І шчасце, што машына стаяла каля дома, бо ён працаваў шафёрам. Бацька загрузіў усіх у машыну і павёз у бальніцу... Дзетак і маму давёз, а тая суседка так і не даехала... Тады і роды ў мамы пачаліся. Доўга не маглі нічога зрабіць, але ж ён нарадзіўся...

* * *

Анатоль Сыс сам апісаў сваё цудоўнае нараджэнне ў вершы-рэпартажы „Неапаленай Купіне". Твор як пад заказ падыходзіць у нашу дзядоўскую хроніку. Тут таксама знойдзем адказ на пытанне чаму Міра Лукша пабачыла дух Анатоля С. менавіта ў выглядзе прыгажуна паўлінавае вока?! Самі прачытайце:

Калі я быў малы, дык часта думаў,
чаму маці ў мяне такая старая і непрыгожая, аднойчы адважыўся запытаць яе пра шнары на твары, якія глыбока ў душы любіў, якія тысячы разоў цалаваў.

— *Ох, сынок мой! Гэта ж здарыўся пажар, і я яшчэ з адной жанчынай абгарэлі крэпка. Жанчына тая памерла. І ў мяне былі апаленыя і рукі, і грудзі, і твар... І была я цяжарная табою. Сынок мой, і ўсе казалі, гэта я даведалася потым, што ці я памру, ці дзіця народзіцца мёртвым. Аж нарадзіла я цябе, сынок мой, жывенькага, толькі на твары была чырвоная плямінка. Я думала, след ад пажару, але аклямаўся ты трохі, і яна знікла, сынок мой. А была я прыгожая да пажару. Ды хіба ў непрыгожай маці мог нарадзіцца такі сынок мой?...*

Як святарны абраз,
людзі вынеслі маці з пажару,
бы вужаку, маланку аддзёрлі
ад белых грудзей,
каб суцішыць пакуты —
паклалі пад цёмную хмару
і, каб смагу спатоліць,
размову вялі аб вадзе,
а яшчэ гаварылі:
Пярун выбірае шчаслівых.
Маці верыла людзям на шчасце,
цяжарная мной,
І шаптала замову: калюжыны —
гадам вашывым,
полю жытняму — дожджык,
а рэчка крывінцы маёй...
Бы вужака, маланка смактала
ў полымя грудзі
і плявала адрыжкі на самых
прыгожых жанчын,
Неапаленай Купіне — маці
— маліліся людзі,
і пачуў я ва ўлонні:
з пакуты народзіцца
Сын...
Неапаленай Купіне — маці
— малюся адзінай,
я ўсмактаў з малаком і любоў,
і праклёны яе:
Хто плюе на жанчыну —
той, нелюдзь, плюе на Радзіму,
хто гандлюе святынай
— той маці сваю прадае.

(працяг будзе)

10.01 — 16.01

(22.03. — 20.04.) Будзеш мець падтрымку, суцеху і развесяленне ад знаёмых, якія не дадуць табе кінуць твае мары. Прыцягнеш да сябе людзей уражлівых, вартых даверу. Прыкладзіся да працы, афармляй важныя справы звязаныя з фірмай (адпачнеш ад паловы месяца).

(21.04. — 21.05.) 11-15.01. твае разуменне патрэб каханай асобы давядзе да таго, што здабудзеш больш прызнання ў яе вачах. Варта скокнуць на забаву за мяжу, тое-сёе пабачыць; гэтая паездка можа цябе адмяніць. Могуць пабольваць калені і суставы, цікуе прастуда.

(22.05. — 22.06.) Да 12.01. не ўваходзь у фінансавыя суполкі з сябрамі, не пазычай. З 10.01. (да 19.01.) знакаміта наладзяцца не толькі інтарэсы, але і асабістыя справы; можаш брацца за вельмі складанае. Можаш сустрэць на сваёй дарозе духоўных настаўнікаў; не будуць цябе распешчваць. Лепш высыпайся.

(23.06. — 23.07.) Асоба, да якой ты ніколі не меў даверу, цяпер адкрыта выступіць супраць цябе. З 15.01. пераканаешся, якая добрая ў цябе інтуіцыя. Падтрымка калег. Людзі будуць раскрываць перад табой сакрэты. Ахвота схавацца ў цішыне ў куточку. Крыху заашчадзіш.

(24.07. — 23.08.) Будзеш моцны і даверлівы. Часам непатрэбна паблажлівы (да асобы, якая зноў не будзе ганаровай ды шчырай). Не дасіся абманацца. Заінспіруюць і падтрымаюць цябе знаёмыя. У пары шкодная — руціна.

(24.08. — 23.09.) Харызматычная сіла ад 10.01. (аж да 19.01.) дасць табе шанц паказацца і звярнуць на сябе ўвагу. 11, 12, 13.01. — будзь больш адкрытым. Жарсці ў пары, а калі яе ў цябе няма, дык знойдзецца! Найчасцей прабывай сярод блізкіх і добрых знаёмых.

(24.09. — 23.10.) Венера (11-15.01.) дазволіць наладзіць табе новыя кантакты, знайсці шчаслівы выхад з цяжкай сітуацыі. Асабліва гарачыя рандэву. Будзеш наватарам. Не прыкладвай завялікай увагі да думкі іншых, кіруйся ўласным чуццём. Часта адпачывай.

(24.10. — 22.11.) Не хавай крыўдлівасці, нічога не замятай пад дыван. Пакажаш сваю нязломную волю, сілу характару і трывучасць. Час на змаганні ў прафесіі, але добра плануй. Будзеш моцны здароўем, а калі штосьці „зловіш", хутка гэтага пазбудзешся. Але ж не перанатужвайся.

(23.11. — 22.12.) Вельмі дынамічны час, поўны раптоўных паваротаў і зменлівых акалічнасцей. Будзь гнуткі, і старайся, каб уся пара не пайшла ў гудок. У здароўі ненайгоршая форма, але не пераацэньвай сваіх сіл, каб не трапіць у небяспечныя сітуацыі.

(23.12. — 20.01.) Будзеш вельмі смелы, кемлівы, паспяховы, схочаш усё зрабіць пасвойму; не заўсёды добра на гэтым выйдзеш, асабліва пры палове месяца. У пачуццях давярай інстынкту. Найлепшая фізічная форма да паловы месяца. Ад 13.01. будзеш прымушаны адмовіцца ад некаторых мерапрыемстваў і дапрацаваць некаторыя дэталі; нічога не занядбоўвай!

(21.01. — 19.02.) 11-15.01. — адвага, упэўненасць; знакаміта дагаворышся з іншымі і пераканаеш іх да сваіх ідэй. Далей спрыяе табе шчасце. Можаш памяняць інтэр'ер кватэры. Пры канцы тыдня пільнуй тэрміновых аплат!

(20.02. — 21.03.) Усё, што ішло слімаковым тэмпам, рушыць з капыта. Многа навучышся, развінеш свае таленты і ўмеласці, пачнеш рэалізаваць усе свае мары. Трапныя інвестыцыі. Нервовасць разгрузі мастацтвам. Усе звернуць на цябе ўвагу! 12-16.01. — могуць турбаваць цябе немалыя праблемы з паразуменнем з атачэннем; могуць не ўдацца планаваныя падарожжы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960